ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

7 СНЕЖНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №236 (28600)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Інтэрнэт-імідж педагога



## У рэйд з участковымі



## Па Італіі на веласіпедзе

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Кірыл МАЛАДЦОЎ, намеснік міністра энергетыкі Расійскай Федэрацыі:**

*«Беларусь і Расія ўжо ўзгаднілі індыкатыўны баланс паставак нафты на будучы год. Баланс звярстаны, усё — як і меркавалася: 24 млн тон нафты. Згодна з раней дасягнутымі дамоўленасцямі, на працягу шасці гадоў, да 2024-га, пастаўкі нафты з Расіі ў Беларусі будуць дасягаць аналагічнага аб'ёму — 24 млн тон. Пры гэтым 18 млн тон будуць накіраваны на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, а 6 млн тон — на экспарт. За перыяд са студзеня па лістапад 2017 года аб'ём паставак нафты з Расіі ў Беларусь склаў 16,4 млн тон, што ў цэлым адпавядае раней дасягнутым дамоўленасцям».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0252 | ▲ |
| Еўра | 2,3956 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЁЛАЧКА, ЗАПАЛЬВАЙСЯ!



Манцёр-высотнік электрасеткавага раёна №5 унітарнага прадпрыемства «Мінскгарсвятло» Віталь ГРЫБОВІЧ упрыгожвае электрагірляндамі, дыёдамі, лямпамі і ліхтарыкамі навагоднюю ёлку, якую гэтымі днямі паставілі на сталічнай плошчы Незалежнасці.

Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

■ Даступная дабрыня

## Патрэбныя людзі! Сагрэць душу...

### Як дапамагчы іншым, не аддаючы вялікіх грошай



**Чую слова «дабрачыннасць» — і першая думка, што прыходзіць у галаву: «Ахвяраваць грошы». Беднаму, што стаіць на вуліцы з працягнутай рукой, ці хвораму дзіцяці, на лячэнне якога не хапае сродкаў... Вікторыя КРУТ, якая арганізавала валанцёрскі рух «Патрэбныя людзі», лічыць інакш: «Не трэба мець еўравыя рахункі, каб ладзіць святы ў дзіцячых дамах ці ў дамах састарэлых. Калі мы едзем, то кожны набывае па торціку і ўпакоўку соку — і ў добрым настроі прыязджаем у госці. Нічога нерэальнага. Атрымліваецца незатратна, але душэўна».**

СТАР. 4

■ Жыллё

## КАБ ВЫБАР БЫЎ ПА КІШЭНІ...

### Актуальныя трэнды Мінска: мінімальныя плошчы і адсутнасць нават чарнавога аздаблення

**Пяты месяц на першасным рынку нерухомасці сталіцы пануе ажыўленне. Патаннелыя крэдыты і малыя цэны падштурхнулі насельніцтва вырашаць жыллёвае пытанне сёння. Аб тым, што цяпер выбіраюць пакупнікі, якія праекты найбольш запатрабаваныя і якія канкурэнтныя перавагі ў барацьбе за пакупніка забудоўшчыкі выкарыстоўваюць, расказала Юлія ШАБРОВА, намочнік па маркетынгу кіраўніка групы кампаній «Твая сталіца».**

Узровень попыту на навабудоўлі за апошнія паўгода вырас на трэць. Пры гэтым пакупніцкая цікавасць размяркоўваецца нераўнамерна — гэта мы бачым, аналізуючы статыстыку даведніка па навабудоўлях (партал ProMetr.by): асобныя праекты істотна выйграюць у канкурэнтаў. Так, скажам, аб'ектам на Дзяржынскага, 15 цікавасць у паўтара—два разы часцей, чым іншымі ў гэтым жа раёне. І прычына нават не ў цане квадратнага метра, а ў высокай ступені гатоўнасці аб'екта, невялікіх плошчах кватэр і, што немалаважна, надзейнай рэпутацыі забудоўшчыка.

#### Гігантызм сыходзіць у мінулае

Разумеючы пажаданні пакупнікоў і іх фінансавыя складанасці, забудоўшчыкі ідуць насустрач попыту і імкнуцца зрабіць свае аб'екты больш канкурэнтаздольнымі за кошт памяншэння выніковай цаны кватэр і стварэння ў жылых комплексах адзінага сучаснага сацыяльнага асяроддзя.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Выбары—2018

# З'ЯВЯЦЦА НОВЫЯ ПАЛІТЫКІ

**У цяперашняй выбарчай кампаніі чакаецца ўдзел даволі вялікай колькасці кандыдатаў-індывідуалаў. Аб гэтым паведаміла журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія ЯРМОШЫНА перад пачаткам семінара-вучобы з кіраўнікамі і арганізатарамі кампаніі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў, які праходзіў учора ў Віцебску.**

Каментуючы звароты, якія цяпер паступаюць у Цэнтральную камісію, Лідзія Ярмошына адзначыла, што яны ў большасці датычацца парадку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Высвятляюцца нюансы дэкларавання маёмасці, выкарыстання сродкаў выбарчага фонду, вядзення агітацыі... «Усё гэта сведчыць аб тым, што ў нас даволі шмат уступае ў барацьбу кандыдатаў-індывідуалаў. Таму што, як правіла, тыя, хто ідзе на выбары ад партыі, больш дасведчаныя ў такіх дэталях і пытаннях. Такім чынам, у нас будуць нечаканыя асобы і з'явяцца новыя палітыкі. Тыя, якія цяпер паўдзельнічаюць у выбарах», — цытуе БЕЛТА старшыню ЦВК.

Рэспубліканскія семінары, на якіх абмяркоўваюцца пытанні работы тэрытарыяльных камісій, вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, рэгістрацыі ініцыятыўных груп, пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# АПАЗНАВАЛЬНЫЯ ЗНАКІ ДРЫБІНШЧЫНЫ



**Гісторыя Дрыбіншчыны, як тэрытарыяльнай адзінкі, нагадвае арэлі. Раён, як адміністрацыйную адзінку, тут утваралі і расфарміроўвалі некалькі разоў. Старшыня Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый ВАСІЛЕЎСКІ лічыць, што кожны рэгіён адметны. Трэба толькі прыкмячаць асаблівасці і ўмець іх выкарыстоўваць.**

***— Апошні раз Дрыбінскі раён быў асобна створаны пасля Чарнобыльскай аварыі. У той час сюды перасялялі людзей з забруджаных радыяцыяй мясцін. Ці ўплывае гэта акалічнасць на цяперашняе жыццё раёна?***

— Пасля адсялення людзі мелі патрэбу ў жыллі і працоўных месцах. І сёння мы назіраем цікавую карціну: у самім Дрыбіне жыве каля 3 тысяч чалавек, а ў перыферыйных вёсках яшчэ 7 тысяч, прычым маем шэсць буйных паселішчаў, дзе пражывае больш за тысячу людзей — гэта такія, як Міхееўка, Расна, Кароўчына... Там створана моцная і камфортная інфраструктура, што, безумоўна, станоўчы фактар. У той жа час ёсць і цяжкасці. Напрыклад, застаюцца незапатрабаванымі значныя плошчы памяшканняў у дзіцячых садах, школах — пры Савецкім Саюзе разлічвалі на вялікую колькасць перасяленцаў, а пасля стала зразумела, што спраектаваныя будынкі выкарыстаць поўнасцю не атрымліваецца. Мы аб'ядноўваем установы, напрыклад, школу і дзіцячы садок, а вызваленае памяшканне пераходзіць пад іншыя патрэбы. Так, у Кароўчыне памяшканне дзіцячага садка цяпер займае Дом рамёстваў, дзе майстры прадстаўляюць сёння каля 20 відаў старажытных промыслаў, у тым ліку — пляценне лапцяў. Гэта паспрыяла таму, што цяпер Кароўчына ўключана ў турыстычны маршрут.

***— Традыцыйна многія раёны Беларусі займаюцца сельскай гаспадаркай як асноўнай дзейнасцю. Раскажыце, дзе працуюць сёння жыхары, якія перспектывы ў тых, хто хоча мець занятак на Дрыбіншчыне?***

— Сапраўды, буйных прамысловых аб'ектаў у нас няма. З працаздольнага насельніцтва, якога ў нас каля 5,5 тысячы, значная частка спецыялістаў занятыя ў сферы адукацыі, аховы здароўя, камунальнай гаспадаркі. Абслугоўваннем займаецца спажыўкааперацыя, на якую кладзецца каля 75 працэнтаў работы, і прыватны сектар. З прадпрымальнікаў значная частка занята будаўніцтвам і дрэваапрацоўкай, а таксама гандлем. З найбольш удалых інвестыцыйных праектаў магу назваць прадпрыемства «Суражы». Дзве дзяўчыны з Мінска вырашылі арганізаваць тут швейную майстэрню і прапануюць дастаткова выгадныя вакансіі для мясцовых жыхароў. Існуе верагоднасць, што фермер з суседняга Шклоўскага раёна набудзе ў нас участак зямлі — яму патрэбны плошчы пад вырошчванне бульбы.

Што датычыцца маладых спецыялістаў, то апошнім часам да нас прыйшло многа медыкаў — менавіта людзей з вышэйшай адукацыяй, якія павінны адпрацаваць пяцігадовы кантракт. Мы з імі займаемся, прапануем жыллё, дапамагаем набыць мэблю. Зразумела, заўсёды існуе частка маладых людзей, якія затрымаюцца тут толькі на час адпрацоўкі, але з гэтым даводзіцца мірыцца. Хочацца сказаць, што хлопцы і дзяўчаты правільна матываваныя, яны разумеюць, што ніхто, акрамя іх саміх, не стане зарабляць грошы. Пакуль заробак невялікі, шукаюць пабочны даход: трымаюць гаспадарку, падпрацоўваюць, бяруць дадатковыя змены. Хоць мая пазіцыя — калі чалавек робіць сумленна, заробак у яго павінен быць такі, каб на яго можна было ўсё купіць.

***— Дрыбінскія вырабы з вොўны ператварыліся ў сімвал раёна, які пазнаюць нават за мяжой. Якую ролю адыгрывае рамесніцтва ў развіцці раёна?***

— Трэба адрозніваць рамесніцтва ад народных промыслаў. Для мясцовых работнікаў культуры самае галоўнае — захаваць традыцыю, перадаць тое, чым знакамітая Дрыбінская зямля ў культурным плане, наступным пакаленням. На гэтай ніве вялікая работа пачалася адразу пасля ўтварэння раёна. У нас не самая лепшая для земляробаў глеба, многа пяскоў, таму сяляне здаўна не маглі мець добрыя ўраджаі і займаліся адыходным шапавальствам — гэта калі майстар восенню пасля палявых работ выпраўляўся ў дарогу з інструментамі і вандраваў так па навакольных селішчах. Некаторыя заходзілі вельмі далёка, існуюць звесткі, што адзін шапавал дабраўся нават да Амерыкі. Работнікі гісторыка-этнаграфічнага музея захоўваюць традыцыю вырабу і папулярызуюць яе, аднак у іх дзейнасці няма камерцыйнага пачатку. Сакрэты валення захаваліся ў некаторых сем'ях, там, сапраўды, майстры могуць працаваць дзеля продажу. Некаторыя жыхары арганізуюць аграсядзібы. У любым выпадку народныя промыслы становяцца для турыстаў апазнавальным знакам раёна.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *urgel@zviazda.by*

■ Добрая справа

# Беларусаў вучаць даглядаць за пажылымі і цяжкахворымі

**Супрацоўнікі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Магілёўскай і Мінскай абласцей прайшлі навучанне прафесійнаму догляду за пажылымі і цяжкахворымі людзьмі. Гэта новы этап кампаніі па комплекснай падрыхтоўцы такіх спецыялістаў.**

— Сёння Беларусь, як і ўвесь астатні свет, сутыкаецца з праблемай старэння насельніцтва. У краіне расце колькасць людзей, якія маюць патрэбу ў штодзённай дапамозе. Галоўныя мэты нашай школы — павышэнне якасці паслуг па патранажным доглядзе, дапамозе ў рэабілітацыі пасля цяжкіх хвароб і траўмаў, фарміраванне культуры догляду за людзьмі, якія маюць патрэбу ў ім, — кажа **арганізатар курсаў, кіраўнік школы прафесійнага догляду «Азбука клопату» Алена МАРЫГЕРОЎСКАЯ.**

Супрацоўнікі ТЦСАН і дамоў-інтэрнатаў прайшлі навучанне на бязвыплатнай аснове на базе РУП «Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр». Удзельнікі праграмы атрымалі навыкі работы з пажылымі, цяжкахворымі і людзьмі з інваліднасцю, а таксама аказання ім даўрачэбнай дапамогі і работы са спецыялізаваным абсталяваннем.

Заняткі праводзілі эксперты з багатым практычным досведам: псіхолагі, неўролагі, фізіятэрапеўты, спецыялісты па рэабілітацыі і геранталогіі. У ходзе практычных семінараў супрацоўнікам ТЦСАН расказалі таксама пра этыку і псіхалогію пабудовы камунікацый з чалавекам, які мае патрэбу ў доглядзе, а таксама з яго сваякамі.

А ў снежні курсы школы «Азбука клопату» стануць даступныя ўсім ахвотным атрымаць новую спецыяльнасць, а таксама сваякам цяжкахворых і пажылых людзей — але ўжо на платнай аснове.

Стаць удзельнікам курсаў можна, патэлефанаваўшы па нумары 8 025 602-55-40.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Брытанскія спецслужбы прадухілілі замах на Тэрэзу Мэй



Брытанская паліцыя арыштавала двух мужчын, якія планавалі падарваць рэзідэнцыю прэм'ер-міністра Тэрэзы Мэй і забіць палітыка. Аб гэтым піша газета Independent. Выданне высветліла, што, па версіі дзяржаўнага ведамства брытанскай контрразведкі Мі5, падазраваныя планавалі пранесці сумку з бомбай да брамы рэзідэнцыі на Даўнінг-стрыт, пасля чаго напасці на палітыка з нажамі.

### Бангладэш адправіць бежанцаў-рахінджа на бязлюдны востраў

Улады Бангладэш падрыхтавалі план па перасяленні часткі бежанцаў-рахінджа, якія пражываюць у краіне, на бязлюдны востраў у Бенгальскім заліве. Пра гэта паведамляе тэлеканал CNN са спасылкай на дакумент, падрыхтаваны Міністэрствам планавання Бангладэш. Згодна з ім, гаворка ідзе пра перасяленне каля 100 тысяч бежанцаў-рахінджа з прыкладна аднаго мільёна, якія зараз знаходзяцца ў краіне. Іх плануецца перавезці на востраў Тэнгар Чар. Цяпер ён з'яўляецца ненаселеным. Па звестках CNN, у мясцовасці, куды плануюць адпраўляць бежанцаў, бываюць паводкі. На рэалізацыю свайго плана ўрад Бангладэш мае намер накіраваць 278 мільёнаў долараў.

### Твіт Барака Абамы сабраў сёлета самую вялікую колькасць лайкаў



Аб рэкордзе, пастаўленым 44-м прэзідэнтам ЗША Баракам Абамам, піша USA Today са спасылкай на кампанію Twitter. Твіт, пра які ідзе гаворка, быў напісаны падчас хваляванняў у Вірджыніі, калі ўдзельнікаў пратэсту супраць зносу помніка дзеячам Грамадзянскай вайны ў ЗША абвінавацілі ў «белым нацыяналізме». Ужо праз двое сутак пасля публікацыі твіт заняў першае месца па колькасці лайкаў за ўсю гісторыю існавання Twitter. На сённяшні дзень ён набраў больш за 4,5 млн лайкаў і больш за 1,7 млн перапостаў. Пры гэтым Дональд Трамп, які фанатычна выкарыстоўвае Twitter у сваёй дзейнасці, не ўвайшоў у топ-10 ні па колькасці лайкаў, ні па колькасці перапостаў.

### Названы галоўны фактар даўгалецця

Міжнародная група генетыкаў высветліла, што працягласць жыцця чалавека ў большай ступені залежыць ад уплыву навакольнага асяроддзя, чым ад генаў. Да такой высновы навукоўцы прыйшлі, вызначыўшы, як з узростам змяняецца эпігенетычная рэгуляцыя геному блізнят. Сярэдні ўзрост 385 удзельнікаў даследавання склаў 69 гадоў. У добраахвотнікаў на працягу 20 гадоў бралі ўзоры крыві, з якіх вылучалася ДНК. На словах навукоўцаў, вынікі даследавання сведчаць, што старэнне чалавека моцна залежыць ад стахастычных (выпадковых) эфектаў і фактараў навакольнага асяроддзя. Такім чынам, працягласць жыцця можна значна павялічыць, ужываючы, напрыклад, здарову ежу або займаючыся фізічнымі практыкаваннямі.


**УВЕДОМЛЕНИЕ о реорганизации ОДО «НП-Сервис»**

В соответствии с п. 72 Инструкции о некоторых вопросах эмиссии и государственной регистрации эмиссионных ценных бумаг, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 31.08.2016 №78, уведомляем Вас о том, что 04.12.2017 г. единственным участником Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (местонахождение: 220056, г. Минск, ул. Героев 120-й дивизии, 15-81, УНП 100080849) было принято решение о реорганизации путем выделения из ОДО «НП-Сервис» нового хозяйственного общества – общества с ограниченной ответственностью. Все обязательства по облигациям ОДО «НП-Сервис» остаются за ОДО «НП-Сервис»

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Узденского райпо (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **здания магазина, общей площадью 85,4 кв. м, инв. №623/С-58469, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625650100001000081 площадью 0,0485 га, по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Полесская, 31/1**.

Начальная цена с НДС – **33 480,00** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 3 348,00 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с №3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **08.01.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина ТПС №13, общей площадью 77,7 кв. м, инв. №630/С-77689, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623882404601000056 площадью 0,0463 га, по адресу: Минская область, Молодечненский район, Марковский с/с, д. Кучки, 1А**. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0010 га), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги (0,0041 га).

**Задатки 10% от начальной цены (1 290,00 бел. руб.) перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 10 (десяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **08.01.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# КАНВЕРТ ДА ЮБІЛЕЮ


Фота БЕЛТА.

**Спецыяльны памятны штэмпель з нагоды 100-годдзя заснавання Беларускага Дома друку выпушчаны да юбілею флагмана беларускай паліграфіі.**

У цырымоніі гашэння маркіраванага канверта, выдадзенага РУП «Белпошта» да гэтай знамянальнай падзеі, узяў удзел **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** Ён адзначыў, што гісторыя развіцця айчыннай перыёдыкі і кнігавыдавецтва немагчымая без працы калектыву Беларускага Дома друку.

— На сёння ваша прадпрыемства ў краіне — манапаліст, прычым у найлепшым сэнсе гэтага слова. Гэта высокапрафесійны і надзейны партнёр, які нясе адказнасць за медыйнае суправаджэнне нашага жыцця, — падкрэсліў Аляксандр Карлюкевіч.

**Намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Валерый ЯРМОШКА** дадаў, што сёння паліграфічны выторца задавальняе попыт на друкаваныя выданні ў поўным аб'ёме. Тут штомесяц выпускаецца каля 30 мільёнаў экзэмпляраў газет і друкуецца каля 2 мільёнаў асобнікаў кніг у год. Пры гэтым калектыў працуе з неблагімі паказчыкамі. У прыватнасці, рэнтабельнасць продажаў за 9 месяцаў гэтага года склала 8%.

Акрамя выпуску перыядычных выданняў і кніг, шукае прадпрыемства і іншыя кірункі дзейнасці. Як расказаў **генеральны дырэктар РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» Раман АЛЕЙНІК,** сёння адным з перспектыўных кірункаў з'яўляецца выпуск упакоўкі. Штогод яе колькасць у агульным аб'ёме прадукцыі прадпрыемства істотна расце і сёлета складае 25%. Вырабляюць тут і разнастайную сімволіку: дзяржаўную, спартыўную, карпаратыўную. Дарэчы, сцяг №1, які развіваецца ў сталіцы на плошчы Дзяржаўнага сцяга, зроблены менавіта тут. Сёння ў калектыве гэтага найстарэйшага паліграфічнага прадпрыемства Беларусі працуе 700 чалавек.

**Першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена СКРЫПЧЫК** звярнула ўвагу на тое, што Беларускі дом друку займаецца і выпускам беларускіх філатэлістычных матэрыялаў. Тут надрукавана каля 600 відаў марак. «Белпошта» ў сваю чаргу прэзентавала да юбілею прадпрыемства маркіраваны канверт з выявай яго будынка і лагатыпам.

**Алена КРАВЕЦ.**

■ Год навукі

# НЕ ІЛЮЗІЯ, А ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ

## Праект стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040» будзе вынесены на II з'езд вучоных

**Па словах дырэктара Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі Валерыя ГАНЧАРОВА, «гэта наша спроба ўбачыць доўгатэрміновыя перспектывы развіцця навукі». Сёння многія краіны свету маюць аналагічныя звышдоўгатэрміновыя стратэгічныя прагнозныя дакументы на перыяд да 2040-га, 2050-га і нават да 2100 года.**

— Нам могуць сказаць, што навукоўцы спрабуюць зазірнуць за межы жыцця аднаго пакалення вучоных. Не буду адмаўляць, гэта насамрэч так. Але калі мы не будзем бачыць нашых аддаленых перспектыў, кропак росту, куды трэба рухацца, то ўвогуле нікуды не прыйдзем, — лічыць адзін з распрацоўшчыкаў гэтага дакумента. — Стратэгія з'явілася не на пустым месцы, яна была распрацаваная на аснове ідэй, якія ўтрымліваліся ў шэрагу публікацый, абмяркоўваліся на розных навукова-інфармацыйных форумах, канферэнцыях, семінарах, сімпозіумах. У гэтым дакуменце адлюстраванае канцэптуальнае бачанне будучыні Беларусі інтэлектуальнай, якая забяспечыць нам лідзіруючыя пазіцыі ў сусветнай навуковай супольнасці. Адзначу, што работа над канцэпцыяй распачалася ў Акадэміі навук, мы былі яе ініцыятарамі, але затым да яе шырока падключыліся органы дзяржаўнага кіравання, канкрэтныя вучоныя і навуковыя калектывы.

«Наша бачанне мадэлі Беларусі інтэлектуальнай будуецца на трох ключавых элементах: гэта поўнафарматнае ўкараненне лічбавых тэхналогій, развіты неаіндустрыяльны комплекс і высокаінтэлектуальнае грамадства, — растлумачыў Валерый Ганчароў. — Кожны з нас павінен стаць вучоным і творцам, кожны — на сваім месцы. Таму я заклікаю далучыцца да планамернай рэалізацыі стратэгічнай задачы ўсё навуковае грамадства, адміністрацыйныя органы, органы дзяржкіравання, бізнес-сектар і чацвёртую ўладу — СМІ».

Дасягнуць запланаванага ўзроўню развіцця навукі і тэхналогій плануецца ў тры этапы. Першы з іх разлічаны на 2018—2020 гады, калі будзе адбывацца актуалізацыя навуковатэхнічнага патэнцыялу Беларусі. За гэты перыяд плануецца распрацаваць план мадэрнізацыі традыцыйных галін, укаранення ў іх найноўшых тэхналогій і тэхнікі, а таксама сфарміраваць нарматыўна-прававую базу для рэгулявання навуковай і інавацыйнай дзейнасці, дзяржзаказ на правядзенне навуковых даследаванняў і навукова-тэхналагічных работ. Таксама ў 2018—2020 гадах прадугледжваецца забяспечыць абнаўленне адукацыйных праграм і перайсці да новых стандартаў вышэйшай адукацыі, каб забяспечыць фарміраванне і развіццё кадраў для інтэлектуальнай эканомікі. Мэта другога этапу (2021—2030 гады) — стварэнне сістэмных умоў для лічбавай мадэрнізацыі традыцыйных галін і выбар кропак росту навукаёмістай эканомікі Беларусі.

На трэцім этапе (у 2031—2040 гадах) плануецца нарасціць кампетэнцыі ў мэтавых сегментах інтэлектуальнай эканомікі і выйсці па іх на лідзіруючыя сусветныя пазіцыі. У гэты перыяд плануецца стварыць умовы для развіцця нацыянальнай эканомікі на аснове вытворчасцяў V і VI тэхналагічных укладаў.

Галоўным вынікам рэалізацыі стратэгіі павінна стаць стварэнне высокаэфектыўнага эканамічнага комплексу, здольнага забяспечыць высокі ўзровень жыцця насельніцтва. Плануецца, што да 2040 года чацвёртая частка прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў Беларусі будзе інавацыйнай, гэта значыць, новай для беларускага рынку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zvizda.by

■ Здарэнне

# Кола патрапіла ў жанчыну

**У Мінску ў грузавіка падчас руху адарвалася кола і збіла жанчыну на прыпынку.**

Па звестках АДАІ Заводскага РУУС сталіцы, інцыдэнт адбыўся каля 9.20 на Партызанскім праспекце. Паводле папярэдняй інфармацыі, у грузавой машыны-кантэйнеравоза, якая ехала з боку вуліцы Куляшова ў напрамку вуліцы Жылуновіча, на ходу адляцела адно з задніх колаў. Яно выкацілася на тратуар і збіла з ног 40-гадовую жанчыну на прыпынку грамадскага транспарту. Медыкі, што прыбылі на месца здарэння, дыягнаставалі ў пацярпелай чэрапна-мазгавую траўму. Жанчына атрымала рваную рану ілба, ёй наклалі чатыры швы. Таксама ў яе ўдар абодвух кален. Па папярэдніх звестках, кіроўца перад паездкай не праверыў тэхнічны стан транспартнага сродку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ На слыху

# РАСІЙСКІЯ СПАРТСМЕНЫ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ У АЛІМПІЯДЗЕ...

## але толькі пад нейтральным сцягам

### Такое рашэнне прыняў Міжнародны алімпійскі камітэт на пасяджэнні выканкама ў Лазане



**Лёс расійскіх атлетаў вырашалі 15 членаў МАК. На пасяджэнні былі прадстаўлены даклады камісіі пад кіраўніцтвам Дзяніса Освальда, якая займалася пераправеркай сочынскіх допінг-проб і выяўленнем слядоў выкрыцця, а таксама Самуэля Шміта, які ўзначальваў другую камісію. Прадстаўнікі МАК павінны былі ўстанавіць ролю і ўдзел дзяржаўных органаў у допінгавай сістэме ў Расіі.**

Пасля пасяджэння прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах абвясціў вердыкт — расійскія спартсмены, якія паедуць у Пхёнчхан, атрымаюць абрэвіятуру OAR (Olympic Athlete from Russia — алімпійскі атлет з Расіі). У гонар пераможцаў і прызёраў з Расіі на ўзнагароджанні падчас зімовых Гульняў будзе ўзняты нейтральны алімпійскі сцяг і будзе выкананы алімпійскі гімн. Алімпійскі камітэт Расіі, удзел якога ў Міжнародным алімпійскім камітэце прыпынены, павінен пакрыць выдаткі, панесеныя МАК на правядзенне расследавання, і ўнесці ўклад у развіццё Незалежнай арганізацыі допінг-тэсціравання на суму $15 млн для стварэння цэласнай антыдопінгавай сістэмы.

Спецыяльная камісія, якую ўзначаліць кіраўнік Незалежнай арганізацыі допінг-тэсціравання Валеры Фурнейран (у яе склад таксама ўвойдзе спецыяліст, прызначаны Сусветным антыдопінгавым агенцтвам (WADA), і спецыяліст ад арганізацыі па барацьбе з допінгам DFSU (Doping Free Sport Unit), а таксама Рычард Баджэт, кіраўнік медыцынскага дэпартамента), вызначыць «чыстых» атлетаў, якія змогуць прыняць удзел у Алімпіядзе—2018.

Прэтэндаваць на ўдзел у Гульнях змогуць спартсмены, якія прайшлі кваліфікацыю на спаборніцтва, не былі дыскваліфікаваныя ці адхіленыя за парушэнне антыдопінгавых правілаў, а таксама прайшлі допінг-тэсціраванне, рэкамендаванае рабочай групай.

У сваю чаргу, **прэзідэнт Алімпійскага камітэта Расіі Аляксандр ЖУКАЎ** паведаміў, што Расія прыме рашэнне аб умовах удзелу ў зімовых Гульнях у Пхёнчхане на Алімпійскім сходзе. *«Яшчэ трэба будзе абмеркаваць гэтае рашэнне. Плануем гэта зрабіць на Алімпійскім сходзе са спартсменамі — кандыдатамі на ўдзел у Алімпіядзе, трэнерамі і прадстаўнікамі федэрацый. На гэтай сустрэчы будзе прынята канчатковае рашэнне па ўмовах удзелу ў Алімпійскіх гульнях расіян».* Алімпійскі сход плануецца правесці 12 снежня.

Рашэнне Міжнароднага алімпійскага камітэта ў дачыненні да Алімпійскага камітэта Расіі пракаментавау **генеральны сакратар Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Георгій КАТУЛІН.** *«Гэта рашэнне выклікала шок, эмоцыі перапаўняюць. Рашэнне дыскваліфікаваць расійскі Алімпійскі камітэт, мне здаецца, ніякім чынам не будзе спрыяць зніжэнню напружанасці і вырашэнню допінгавых праблем у спорце ў цэлым. Рашэнне беспрэцэдэнтна суровае»,* — сказаў Георгій Катулін. Ён таксама нагадаў, што, згодна з палажэннямі алімпійскай хартыі, прадстаўляць краіну на Алімпійскіх гульнях мае права толькі нацыянальны алімпійскі камітэт, а «ў дадзеным выпадку яна (хартыя) не працуе».

Генеральны сакратар НАК Беларусі выказаўся супраць сітуацыі, калі *«расійскія спартсмены і трэнеры павінны выстраіцца ў нейкую чаргу, з якой будуць выбіраць тых, хто адпавядае крытэрыям нейкай прыдуманай камісіі»,* каб паехаць на Алімпіяду. Ён адзначыў, што не ўяўляе, якое рашэнне ў гэтай сітуацыі прымуць расійскія спартсмены — удзельнічаць у Алімпіядзе ці не.

**Сваё меркаванне з нагоды рашэння МАК выказалі і вядомыя беларускія спартсмены.**



**Першы алімпійскі чэмпіён Беларусі Сяргей МАКАРАНКА:**

*— Мы з нецярпеннем чакалі, якое рашэнне вынесе Міжнародны алімпійскі камітэт. Раніцай у сераду даведаўся пра яго і быў вельмі засмучаны, што гэтая сітуацыя вырашылася такім чынам. Усё ж такі расіяне — нашы калегі, браты, сябры. Відаць, іх віна таксама ёсць, парушэнні канкрэтных спартсменаў, напэўна, мелі месца. Трэба ставіцца да допінгу вельмі сур'ёзна, не даводзіць сітуацыю да такога. Але адхіленне Расіі — гэта гіганцкая страта для спорту ў цэлым, эканомікі алімпійскага руху і, самае галоўнае, — больш за ўсіх страцяць аматары спорту. Упадзе відовішчнасць Алімпіяды, бо Расія — гэта краіна-гігант у тым ліку і ў спорце. Можна пакараць некалькі спартсменаў, якія парушылі правілы, але нельга адхіліць усю краіну. Я лічу, што гэта чыстая палітыка, і мы ўжо даўно сталі яе заложнікамі.*



**Сяргей РУТЭНКА, вядомы гандбаліст краіны, сярэбраны прызёр маладзёжнага чэмпіянату Еўропы (2000), 6-разовы пераможца Лігі чэмпіёнаў, а зараз намеснік старшыні Беларускай федэрацыі гандбола:**

*— Я са шкадаваннем гляджу, як спорт ператвараецца ў палітыку. Катэгарычна супраць калектыўнага адхілення краіны ад удзелу ў Алімпіядзе. Відома, трэба караць асобных спартсменаў, якія парушаюць антыдопінгавыя правілы, адхіляць іх ад удзелу ў прэстыжных турнірах. Сёння я праглядаю розную прэсу, не толькі беларускую, расійскую, але і еўрапейскую і пакуль так і не ўбачыў нейкіх выразных, важкіх доказаў у абвінавачванні цэлай краіны.*

*На мой погляд, такое рашэнне ніяк не адносіцца да спорту, таму я адчуваю велізарнае шкадаванне і расчараванне, хоць аптыміст па жыцці і спадзяюся, што сітуацыя яшчэ зменіцца. Нармальны аматар спорту, які знаходзіцца па-за межамі палітыкі, не можа з пазітыўнымі думкамі глядзець на такое рашэнне Міжнароднага алімпійскага камітэта, бо гэта вялікая страта. Узяць хоць бы хакейны турнір, якая Алімпіяда без наймацнейшай зборнай? Гульні страцяць відовішчнасць і аўтарытэт, і мы рызыкуем тым, што пазней Алімпіяду—2018 будуць успамінаць у сувязі з тым, што ў ёй не ўдзельнічала каманда Расіі, як гэта ўжо было на Гульнях, якія байкатавалі некаторыя краіны. А калі казаць з боку спартсмена, то, безумоўна, шкада тых атлетаў, якія сталі заложнікамі такога становішча, гэта, вядома, вар'яцтва — выступаць не пад сцягам сваёй краіны. У мяне пакуль у галаве такая сітуацыя не ўкладваецца.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

# Патрэбныя людзі! Сагрэць душу...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каштоўнасці сучаснага свету часта — на жаль! — матэрыяльныя: мець машыну, кватэру, стройную фігуру, моднае адзенне, шыкоўныя ўпрыгажэнні, самыя сучасныя гаджэты... Але ці можна каго-небудзь з тых, хто імкнецца да іх, папракнуць за жаданне жыць прыгожа? І як жа штосьці па-за межамі ўласных інтарэсаў? Вікторыя, эфектная маладая жанчына з прэстыжнай работай (дызайнер інтэр'ера), даказвае, што пры любым матэрыяльным становішчы можна заставацца чалавекам з вялікай літары: глядзець далей за ўласныя патрэбы, дбаючы аб тых, чые жыццёвыя абставіны склаліся інакш.

Для Вікторыі дапамога іншым ужо даўно стала часткай жыцця: «Для мяне немагчыма штодзень круціцца толькі вакол сваіх інтарэсаў: работа, сям'я, сябры. Ёсць такое паняцце, як сацыяльнае жыццё — дапамога тым, хто ў гэтым мае патрэбу. Калі бачыш вынік ад таго, што робіш, то атрымліваеш задавальненне не меншае, чым ад добра выкананай работы ці шчаслівых вачэй мужа. Толькі трэба ўзняцца над уласнымі інтарэсамі і прыкласці намаганні, каб зладзіць свята не толькі для сябе, але і для раней незнаёмых, а цяпер не чужых нам людзей».

Ёсць яшчэ адзін стэрэатып: найлепшае, чым мы можам падзяліцца з іншымі, мае грашова-матэрыяльнае вымярэнне. Але ў кожнага з нас ёсць рэсурс, куды больш унікальны: навыкі, прафесія, здольнасці, майстэрства. «Аднойчы прыдумалі правесці ў доме-інтэрнаце конкурс прыгажосці: адшукалі дзяўчын, якія робяць прычоскі і макіяж. Зразумела, бясплатна. Чатыры месяцы падрыхтоўкі не прайшлі дарэмна, — усміхаецца Вікторыя. — Напрыклад, у мяне ёсць сябар, які выразае любыя ўзоры па дрэве. Трэба адшукаць усяго адну фанеру, каб ён змог выразаць навагоднія цацкі, якія пасля мы будзем размалёўваць з выхаванцамі домаінтэрната. У кагосьці знойдуцца непатрэбныя фарбы, хтосьці возьме скотч — так усё і пачынаецца».



Музыка, мыльная бурбалкі, надзіманыя шарыкі — стварыць свята для дзяцей прасцей, чым здаецца на першы погляд.

Вікторыя расказвае, што аднойчы ў адной з удзельніц руху да зарплаты не было лішніх грошай, і яна «паабяцала назбіраць на цукеркі». «Я кажу: не трэба такіх ахвяр! Паедзь зараз як ёсць, а калі будзе магчымасць і жаданне, то пасля можна і цукеркі набыць. Не ў тым сутнасць. І гэта правільная пастаноўка пытання, калі ўлічыць сённяшнюю эканамічную сітуацыю ў сем'ях. Па сто долараў укладаць штораз — балюча. А калі кожны па магчымасці штосьці набыў ці зрабіў — гэта ўжо вялікая справа. Напрыклад, з намі заўжды ездзіць фатограф і грошы за здымкі ніколі не бярэ. Пры гэтым важныя не толькі нашы эмоцыі, але і водгук у дзяцей. Нас чакаюць і яны, і выхавацельніцы. За такія невялікія ўкладанні гэта выдатны вынік!»

Цяпер каля 20 чалавек дапамагае Вікторыі рэгулярна. На што хопіць фантазіі, тое і арганізоўваецца: выхаванцы дамоў-інтэрнатаў, з якімі супрацоўнічаюць «Патрэбныя людзі», мелі магчымасць схадзіць на хакей ці на футбол, у планетарый, у кіно, кавярню. А на Новы год валанцёры падрыхтавалі новую акцыю: хлопцы і дзяўчаты напісалі лісты пра тое, як іх завуць, колькі ім гадоў і чым цікавяцца. Валанцёры ўжо атрымалі і прачыталі першыя з пасланняў і цяпер збіраюць кожнаму адпаведныя святочныя падарункі. «Бывае так, што ў дзяцей фарміруецца спажывецкае стаўленне да валанцёраў, якія іх наведваюць. У лістах яны могуць папрасіць айфон ці планшэт, але не кожны можа дазволіць сабе такі дарагі падарунак. Каб выправіць гэта, мы папрасілі расказаць пра сябе, а нашы людзі пастараюцца зрабіць сапраўды патрэбныя для душы падарункі», — дзеліцца Вікторыя Крут.



Валанцёры дапамагаюць не толькі дзецям, але і дарослым. Напрыклад, на сёлетні Дзень маці хлопцы і дзяўчаты наведалі Лагойскі дом састарэлых.

Валанцёрка Наталля Шлома атрымала адзін такі ліст ад дзяўчыны, якая вучыцца ў трэцім класе.

У некалькіх радках яна напісала, што ездзіць на вакацыі ў Ірландыю і мае сям'ю. «Я перш за ўсё збірала рэчы для школы, але крыху незвычайныя. Каляровы сшытак, аловак з казачным героем замест гумкі, тачылка ў выглядзе кубіка, як можна кідаць, альбом для малявання. Дзяўчынка напісала пра сям'ю, таму я прыдумала падарыць ёй рукадзелку з дрэва — чатыры невялікія фотарамкі, якія можна размаляваць і пасля паставіць у іх здымкі кожнага члена сям'і. Таксама набыла набор, з дапамогай якога можна самой сабе зрабіць бранзалет, а яшчэ байку з паеткамі. У мяне ў самой асаблівае дзіця, і мы не раз атрымлівалі гуманітарную дапамогу з недарагімі дробнымі рэчамі, але як гэта было прыемна! Не магу сказаць, што гэты падарунак запатрабаваў шмат грошай. Так, магчыма і давялося сабе адмовіць у кавалачку чагосьці смачнага, але затое гэта такая радасць — рабіць іншаму прыемнае. Яно таго вартае!»

Далучыцца да «Патрэбных людзей» можна праз сацыяльныя сеткі — старонку Вікторыі Крут. Хоць ніхто не перашкаджае вам самастойна сабраць сяброў і зладзіць свята не толькі для сябе, але і для дзяцей з дома-інтэрната ці старых з дома састарэлых.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# КАБ ВЫБАР БЫЎ ПА КІШЭНІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спробы паменшыць плошчы кватэр назіраліся і ў мінулыя гады, але тады гэта адбывалася ў асноўным за кошт адмовы ад шырокіх і доўгіх калідораў. У вачах пераважнай часткі пакупнікоў ідэальная кватэра працягвае выглядаць як мінімальная па плошчы, але з максімальнай колькасцю пакояў. Гэтыя асаблівасці попыту ўжо знайшлі сваё выражэнне ў з'яўленні кватэр так званага еўрафармата — «еўрадвушак» і «еўратрошак». Напрыклад, тое жыллё, якое лічылася яшчэ гады два таму аднапакаёвай кватэрай плошчай 42—44 квадратныя метры, цяпер носіць гордую назву «еўрадвушка» і досыць паспяхова прадаецца. Акрамя таго, «еўрадвушкамі» называюць яшчэ і аднапакаёвыя кватэры-студыі, у якіх дзякуючы наяўнасці двух вокнаў стала магчыма самастойна зрабіць яшчэ адзін пакой.

Цяпер атрымалі шырокае распаўсюджванне і папулярнасць сучасныя планіроўкі, калі кухонная зона аб'ядноўваецца з гасцінай. Але пры гэтым «ізаляванымі» застаюцца адна-дзве невялікія спальні. У выніку, трохпакаёвую кватэру «еўрафармату» плошчай 63 «квадраты» можна набыць за 60,5 тысячы долараў, што супастаўна з коштам стандартнай «двушкі».

## Зусім без аздаблення...

Да гэтага года многія пакупнікі новабудоўляў адрознівалі стан кватэр «з чыставым аздабленнем» і без яго. Але аказваецца, што ёсць яшчэ і «чарнавое» аздабленне, якое, як правіла, уключае тынкоўку сцен і столі, сцяжку падлогі і электрамантажныя работы. І адмова ад яго — гэта яшчэ адзін спосаб зрабіць таннейшым канчатковы прадукт для пакупніка за кошт зніжэння выдаткаў забудоўшчыка. У гэтым выпадку пакупнікам прапануюць заплаціць за голыя сцены ў літаральным сэнсе — ніякага ўнутранага аздаблення, усё — на густ будучых жыхароў.

## Не кропкавая забудова, а кам'юніці

Другая ж частка забудоўшчыкаў ідзе іншым шляхам — не зніжаючы цэн, яны фарміруюць імідж забудовы, прапаноўваючы новы падыход да фарміравання жылой прасторы ў доме і па-за яго межамі. Вам прапануюць унікальнае афармленне фасаду, вялікія дзіцячыя пляцоўкі, двары без машын і нават фантаны. Гэты падыход выкарыстоўваецца для вялікіх жылых комплексаў і патрабуе велізарных выдаткаў на прасоўванне праекта.

— Сёння часта выбар робіцца не на карысць самага таннага жылля, але такога, якое апраўдвае сваю цану месцазнаходжаннем, тэхналогіямі будаўніцтва, планіровачнымі рашэннямі, — працягвае Юлія Шаброва. — Пакупнікі па-ранейшаму аддаюць перавагу аб'ектам у развітых мікрараёнах: станцыя метро паблізу або перспектыва яе з'яўлення, сацыяльныя аб'екты ў пешай даступнасці, экалогія, рэпутацыя раёна — для нерухомасці гэтыя параметры нязменна важныя. У той жа час людзі перасталі баяцца пераезду ў найбліжэйшы прыгарад, чаму спрыяе актыўнае развіццё маштабных жылых комплексаў. Больш за тое, у такіх раёнах фарміруецца адзінае сацыяльнае асяроддзе, так званае кам'юніці. Гэта і прыцягвае цяперашніх пакупнікоў. І ні адна кропкавая забудова не зможа канкураваць па гэтым параметры. Папулярнасць такіх жылых комплексаў, як «Новая Баравая», «Уручская», «Вясёлка», «Азярцо» пацвярджае гэтыя высновы.

## Гульня ў фінансавыя інструменты

Большасць дэвелaпераў імкнуцца выкарыстоўваць актыўнасць на рынку: практычна ўсе буйныя жылыя комплексы прапануюць спецыяльныя праграмы крэдытавання, лізінг і працяглыя растэрміноўкі. Самыя «смачныя» стаўкі па крэдытах на сёння пачынаюцца ад 11%, па лізінгу — ад 5,9%. Максімальная растэрміноўка, прапанаваная забудоўшчыкамі, складае пяць гадоў.

Наяўнасць усіх гэтых інструментаў дае вынік: больш за 50% здзелак, якія праводзяцца сёння на рынку новабудоўляў, — заключаюцца з прыцягненнем крэдытных сродкаў. А прад'яўлены попыт яшчэ вышэйшы.

## Топ-3 даступных прапаноў кватэр

Па інфармацыі партала prometr.by, самыя маленькія па плошчы кватэры прапануюцца ў жылым комплексе «Парк Чалюскінцаў» — аднапакаёвая кватэра плошчай 25 квадратных метраў (у залежнасці ад паверха) ад 35 тысяч долараў. На першы погляд, цана кватэры цалкам дэмакратычная, асабліва з улікам заяўленых характарыстык комплексу, якія адпавядаюць патрабаванням трэцяга класа якасці — «Камфорт». Але калі супаставіць кошт з плошчай, то атрымаем не вельмі прывабную лічбу ў 1400 долараў за квадратны метр, што нават з улікам «прапіскі» аб'екта досыць дорага. Прытым, што гэтая цана актуальная пры аплаце ўсяго кошту кватэры наперад, а ключы ад яе, у лепшым выпадку, можна будзе атрымаць праз тры з лішнім гады — у 2021 годзе. А калі скарыстацца растэрміноўкай, чый максімальны тэрмін абмежаваны двума гадамі, то цана будзе павялічана. Наколькі? Па заяве аддзела продажаў забудоўшчыка канчатковы кошт пры растэрміноўцы абмяркоўваецца ў кожным выпадку індывідуальна, але мінімальнае павелічэнне кошту «квадрата» складае 100 долараў.

**«Чарнавое» аздабленне, як правіла, уключае тынкоўку сцен і столі, сцяжку падлогі і электрамантажныя работы. І адмова ад яго — гэта яшчэ адзін спосаб зрабіць таннейшым канчатковы прадукт для пакупніка.**

На другім месцы рэйтынгу мінімальных плошчаў аднапакаёвых кватэр знаходзіцца дом «Марына-2» (клас «Эканом») у жылым комплексе «Мінск-Мір». Там прапануюцца аднапакаёўкі плошчай 29,5 квадратнага метра. Пры 100-працэнтнай перадаплаце кватэра абыдзецца ў 34 800 долараў, а растэрміноўка павялічвае кошт «квадрата» на 7% гадавых. І радуе тое, што заканчэнне будаўніцтва «Марыны-2» намечана на 2018-ы, а не 2021 год.

Практычна аналагічныя па плошчы кватэры (29,7 квадратнага метра) прапануюцца ў жылым комплексе каля метро «Міхалова» (клас «Эканом»). Выніковая цана кватэры складае 39 500 долараў, а атрымаць ключы ад яе, па заяве забудоўшчыка, можна будзе да канца 2018 года.

На першым месцы рэйтынгу мінімальных плошчаў двухпакаёвых кватэр знаходзіцца жыллё плошчай 32,6 квадратнага метра ў жылым комплексе «Парк Чалюскінцаў». Цана падобных кватэр пачынаецца ад 44 825 долараў пры ўмове 100-працэнтнай аплаты. Гэта — тая самая «еўрадвушка», іншымі словамі, паўнавартасная аднапакаёвая кватэра, якая дазваляе за кошт двух вокнаў і выцягнутай формы кватэры аформіць яшчэ адзін пакой. У выніку атрымаецца адзін прахадны пакой і адзін ізаляваны. Пры гэтым кухня будзе размяшчацца ў «складзе» першага прахадного пакоя.

Крыху вышэй па кошце знаходзяцца двухпакаёвыя кватэры ў панэльным доме класа «Эканом» ад упраўлення капітальнага будаўніцтва «Захад», які будуецца ў раёне вуліц Міхалова—Алібегава. Плошча двухпакаёвых кватэр, якія маюць паўнавартасную выдзеленую кухню, тут складае 57,7 «квадрата», а іх цана 57 720 долараў. Заканчэнне будаўніцтва намечана на трэці квартал 2018 года.

Замыкае тройку рэйтынгу прапанова двухпакаёвых кватэр у доме па 2-й вуліцы Шчорса класа «Камфорт». Там ёсць 49-метровыя «двушкі» коштам 57 820 долараў. Мінімізаваць плошчы кватэр атрымалася за кошт сумяшчэння кухоннай зоны з адным з пакояў. Заканчэнне будаўніцтва дома запланавана на 4-ы квартал 2018 года.

Мінімальная па кошце прапанова з Топ-3 трохпакаёвых кватэр прапануецца ў жылым комплексе «Парк Чалюскінцаў» — плошча кватэры 56,8 квадратнага метра, цана 69 520 долараў (каля 1225 долараў за «квадрат»).

Другое месца займае дом у раёне вуліц Міхалова—Алібегава — па кошце «трохпакаёўкі» ад 72 990 долараў пры мінімальнай плошчы 76,8 «квадрата».

У доме па 2-й вуліцы Шчорса трохпакаёвая кватэра плошчай 64,6 квадратнага метра каштуе 73 600 долараў пры 100-працэнтнай аплаце і 75 520 долараў пры аплаце ў растэрміноўку да ліпеня 2018 года.

Ужо па-за рэйтынгам, для тых пакупнікоў, хто хоча набыць кватэру з паўнавартаснай кухняй, па даступнай цане з наяўных у продажы 1-, 2- і 3-пакаёвых кватэр ёсць прапановы ў дамах №5 і №6 жылога комплексу «Ліпень». Арыенціровачны кошт аднапакаёвай кватэры плошчай 45 «квадратаў» без чыставога аздаблення складае крыху больш за 47 тысяч долараў, двухпакаёвай плошчай 61 квадратны метр — каля 62 800 долараў, трохпакаёвай плошчай 79 «квадратаў» — каля 76 600 долараў. Заканчэнне будаўніцтва заяўлена на пачатак 2018 года. Прапанова ў «Ліпені» цікавая яшчэ і тым, што па ёй даступна атрыманне крэдыту пачатковай стаўкай 7% гадавых, што з'яўляецца мінімальнай прапановай сярод новабудоўляў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

7 СНЕЖНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№23 (15830)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

Лідзія ЗАБЛОЦКАЯ:

# «Ніколі не забуду эмоцый ад «Еўрабачання»

**Шэсць гадоў таму яна з песняй «Анёлы дабра» заняла трэцяе месца на дзіцячым «Еўрабачанні» ў Ерэване. Тады ёй было ўсяго 13, і, як сама прызнаецца, яна марыла назаўсёды звязаць сваё жыццё з музыкай. Пра творчыя праекты, «зорную хваробу» і тое, чаму ў якасці прафесіі выбрала... журналістыку, Лідзія расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Як атрымалася, што ты вырашыла паступаць вучыцца на журналіста?***

— Зараз я на трэцім курсе, але аб гэтай прафесіі задумалася яшчэ ў школе, у восьмым класе, якраз падчас «Еўрабачання». У мяне тады было шмат інтэрв'ю, і я падумала, што гэта вельмі цікава: пастаянна мець стасункі з новымі людзьмі, ездзіць на рэпартажы, даведвацца інфармацыю раней за іншых і потым даносіць яе да чытачоў або слухачоў.

***— Ці былі ў цябе нейкія матэрыялы на момант паступлення?***

— На творчы экзамен я прыйшла з вялікай папкай журналісцкіх работ. У 11 класе мяне ўзялі на стажыроўку на тэлебачанне. Таксама пісала ў газеты. Дарэчы, у «Чырвонцы. Чырвонай змене» апублікавалі адзін з маіх на той момант самых сур'ёзных артыкулаў — аб пракрастынацыі. Памятаю, было шмат выпраўленняў *(смяецца)*.

***— Якімі творчымі праектамі займаешся?***

— Цяпер я старшыня творчага саюза БДУ. Мы ладзім розныя канцэрты, творчыя акцыі. Вось, напрыклад, распрацавалі праект «Універсітэцкі паэтычны форум», дзе ўдзельнічаюць студэнты розных мінскіх ВНУ. Праводзім фестываль першакурснікаў «YFM. #тынаволне», дзе трэба праходзіць этапы з выпрабаваннямі і творча праяўляць сябе. Майстар-класы, мерапрыемствы для забавы і развіцця — гэта тое, дзе я набіраюся натхнення і аддаю частку сябе ўніверсітэту.

***— А што з музыкай: ці выступаеш зараз дзе-небудзь?***

— Калі гляджу якія-небудзь музычныя праекты або шоу, то як быццам бы чую голас той маленькай Ліды, якой я калісьці была. Яна кажа мне: «Паспрабуй! Гэта ж была твая мара!» Адзін час нават мае сябры казалі, што перастануць са мной размаўляць, калі я не пайду на кастынг шоу-праекта «Голас».

Канцэрты БДУ і рэспубліканскія канцэрты, на якія мяне запрашаюць, — гэта добра. Але каб ісці і спрабаваць сябе ў сапраўды сур'ёзных праектах, патрэбен добры аўтарскі матэрыял. Так, я пішу музыку, але для моцнай песні неабходныя такія ж словы. І толькі тады я, магчыма, зраблю тое, што калісьці, у 13 гадоў, здолела са сваім выкладчыкам напярэдадні «Еўрабачання». Але, напрыклад, мае бацькі ўпэўнены: калі я вызначылася з прафесіяй, значыць, і развівацца павінна як журналіст.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***



*Жыццё ў сеціве*

# ІНТЭРНЭТ-ІМІДЖ ПЕДАГОГА,

## або Як не нарабіць памылак у віртуальнай прасторы?

**Ці варта педагогам ствараць акаўнты ў сацыяльных сетках? Якім павінен быць профіль настаўніка: закрытым ці адкрытым? Што можна публікаваць на сваёй старонцы, а што не? Ці трэба дадаваць вучняў у «сябры»? Што можа дазволіць сабе настаўнік у камунікацыі са сваімі выхаванцамі ў інтэрнэце? Адказы на гэтыя пытанні шукаюць многія педагогі, у тым ліку і маладыя, якія завялі свае старонкі «УКантакце» яшчэ ў школьныя ці студэнцкія гады. У рамках міжнароднай выстаўкі-форуму «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» перад беларускімі педагогамі выступіла кандыдат псіхалагічных навук, пазаштатны супрацоўнік расійскага Фонду развіцця інтэрнэт, дацэнт Вікторыя ІЗМАГУРАВА, якая расказала пра «азы» адказных паводзін настаўнікаў у сацыяльных медыя.**

### АГЕНТЫ ІНФАСАЦЫЯЛІЗАЦЫІ

— У прынцыпе існуюць дзве лініі паводзін. Першая, калі педагог цэніць сваю ўнутраную прастору, а таму не выходзіць у сацыяльныя сеткі, або калі ён і мае свой акаўнт, але не дадае вучняў у «сябры». Другая лінія — педагог уключае ў кола інтэрнэт-«сяброў» сваіх выхаванцаў і кантактуе з імі ў сацыяльных сетках. Другая лінія паводзін адназначна больш прыярытэтная, — лічыць спецыяліст, — хоць яна і патрабуе ад педагога высокага ўзроўню інфармацыйнай культуры. Немагчыма забываць, што вы педагог, **нават калі вы заходзіце на сваю ўласную старонку, робіце ў інтэрнэце нейкія публікацыі, — вы ўсё роўна застаяцеся педагогам. І так цяпер будзе заўсёды!**

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***




**Вікторыя ІЗМАГУРАВА: «Настаўнік заўсёды знаходзіцца «пад прыцэлам».**

*Пазнаёміцца з прафесіяй*

# Калі абавязак — дапамагаць

## Першымі гэта робяць участковыя інспектары міліцыі

**— А вы ведаеце свайго ўчастковага? — пытаецца ў мяне Мікалай ЗЕЛЯНОЎСКІ, старшы лейтэнант міліцыі, намеснік начальніка аддзела правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска. — Не? Відаць, пашанцавала з суседзямі. Бо бываюць дамы, куды нас выклікаюць па некалькі разоў на дзень, каб уціхамірыць буйных грамадзян за сцяной.**

**Так, «узброіўшыся» фотаапаратам і дыктафонам, карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай Змены» выправілася ў рэйд з участковымі інспектарамі міліцыі, спрабуючы бліжэй пазнаёміцца з гэтай прафесіяй.**



* * *

— Калі ласка, адпусціце нас. Гэта першы раз, мы больш так не будзем, — рыдаючы, амаль хорам просяць тры дзяўчынкі-падлеткі.

— Калі я вас адпушчу сёння, дык заўтра сустрэну ў іншай кампаніі з чым-небудзь мацнейшым па градусах, — кажа Мікалай.

У той вечар 15-гадовыя прыгажуні ў адным са сталічных двароў «ласаваліся» чатырма літрамі моцнага піва.

— Мы абяцаем, што больш такога не паўторыцца, — не супакойваюцца школьніцы. — А бацькам раскажаце, што мы рабілі?

— Дзяўчаты, не трэба плакаць. Зараз адвядзём вас у апорны пункт, прыедзе інспектар па справах непаўналетніх, і вы яму ўсё растлумачыце, — уступае ў гутарку **Ганна МАКАРЭВІЧ, старшы лейтэнант міліцыі, участковы інспектар.**

Праваахоўнікі кажуць, што інцыдэнты з дзецьмі і падлеткамі заўсёды вылучаюцца сярод іншых сваёй эмацыянальнасцю. Пры гэтым няважна, пацярпелыя яны або правапарушальнікі.

***(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)***

# ІНТЭРНЭТ-ІМІДЖ ПЕДАГОГА...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Вікторыя Ізмагурава расказала пра такі новы феномен, як інфасацыялізацыя. Уліванне моладзі ў соцыум адбываецца цяпер пераважна ў інтэрнэт-асяроддзі, таму ў сучасных педагогаў з'явілася новая задача — стаць для падрастаючага пакалення агентамі інфасацыялізацыі.

Інфармацыйная культура ўвогуле стала неад'емнай часткай агульнай культуры чалавека. Але што пад ёй маецца на ўвазе? «Найперш гэта здольнасць адбіраць якасную інфармацыю ў інтэрнэце, умець ацэньваць яе праўдзівасць, важнасць, а таксама ўменне мадэляваць свае паводзіны ў інтэрнэце, каб яны былі максімальна эфектыўнымі, канструктыўнымі і не закраналі нічыіх інтарэсаў, — тлумачыць спецыяліст. — А калі гаварыць пра інфармацыйную культуру педагога, то яна ўключае таксама здольнасць уплываць на інфармацыйную культуру вучня, фарміраваць яе. Пры гэтым настаўнік павінен сам добра валодаць інтэрнэт-тэхналогіямі плюс высокімі маральна-этычнымі якасцямі».

**Прыкметай дрэннага тону лічыцца і празмернае захапленне сэлфі.**

Калі педагог сёння не прадстаўлены ў інтэрнэт-асяроддзі, у вачах сваіх вучняў ён адразу страчвае ачкі. Лічбавае пакаленне гэтага не можа зразумець. Таму **настаўніку трэба ісці ў сацыяльныя сеткі** — туды, дзе праводзяць па некалькі гадзін у дзень яго падапечныя.

Лабараторыя Касперскага правяла даследаванне, якое ўстанавіла, што 90 працэнтаў расійскіх педагогаў выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі ў асабістых мэтах. 73 працэнты дадаюць вучняў у «сябры». Адкрыты акаўнт з іх маюць 67 працэнтаў. А 25 працэнтаў тых, хто сябруе з вучнямі ў сеціве, не праводзяць на гэтых пляцоўках ніякай педагагічнай работы. Дзецям, між іншым, патрабуецца нейкі арыенцір, эталон паводзін.

Стасункі ў сацыяльных сетках маюць шмат адметнасцяў, якія настаўніку заўсёды трэба мець на ўвазе. Нябачнасць суб'ектаў камунікацыі, ананімнасць і слабая рэгламентаванасць паводзін у інтэрнэце ствараюць у дзяцей уражанне ўседазволенасці, калі ім здаецца, што сціраецца мяжа паміж статусамі, што не трэба захоўваць правілы субардынацыі, яны пераходзяць на слэнг. «Інтэрнэт — гэта абсалютная свабода без абмежаванняў і забарон» — так лічаць вельмі многія падлеткі і накіроўваюцца туды, дзе іх ніхто не кантралюе. Да таго ж частка карыстальнікаў любіць ствараць віртуальныя асобы — гэта калі ў сеціве адыгрываецца пэўны жыццёвы сцэнарый, важны для канкрэтнага чалавека. Тое, што ён ніколі не дазволіць сабе ў рэальным жыцці, з лёгкасцю дазваляе сабе ў інтэрнэце. Віртуальны лад жыцця аказваецца больш важны за рэальнасць.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## СПАМ НЕ ВІТАЕЦЦА

Вікторыя Ізмагурава расказала пра асноўныя правілы прафесійнай этыкі, якія педагогам рэкамендуецца выконваць, калі яны заходзяць у сацыяльныя сеткі. Галоўны прынцып — неабходнасць прытрымлівацца тых жа стандартаў паводзін, што і ў рэальным жыцці. «Вобраз настаўніка ў класе, школе і ў сацыяльных сетках павінен супадаць. Гэта вельмі важна для фарміравання даверу паміж ім і навучэнцамі. Таму беражыце сваю рэпутацыю. Для педагога недапушчальнае выкарыстанне ненарматыўнай лексікі, сумнеўных фатаграфій і тэкстаў у інтэрнэце, — падкрэслівае псіхолаг. — Здараецца, што чалавек у эмацыянальна прыгнечаным стане ці, наадварот, падчас моцнага ўзрушэння піша дзіўныя тэксты, што настаўніку катэгарычна забаронена рабіць. Моцная эмоцыя — не падстава падзяліцца ёй з усім светам».

**Пісаць у сетках педагог павінен правільна і без скарачэнняў, таму што ўсяму, што ён робіць, удзяляецца асаблівая ўвага.**

Памятайце, што ў сацсетках вы размаўляеце з людзьмі. Маецца на ўвазе, што ў інтэрнэт-перапісках трэба кіравацца прынцыпам «Ці сказаў бы я тое самае чалавеку ў твар?».

Зрэшты, прынцыпы інфармацыйнай этыкі агульныя для ўсіх, а не толькі для педагогаў. Гэта захоўванне правa на прыватную перапіску. Выкладваць перапіску з іншым чалавекам у агульны доступ ці перасылаць яе іншаму «сябру» па сацыяльнай сетцы недапушчальна.

Трэба паважаць час і магчымасці іншых, таму не рэкамендуецца «спаміць»: распаўсюджваць «вірусны» кантэнт, фэйкавыя навіны, прыхаваную рэкламу і іншае інтэрнэт-смецце. Увогуле распаўсюджванне непатрэбнай інфармацыі прыводзіць да таго, што да яе перастаюць сур'ёзна ставіцца, і гэта правакуе зніжэнне аўтарытэту таго чалавека, які яе рассылае.

Нельга прасіць перапосціць інфармацыю, размешчаную на вашай старонцы. Гэта элементарная сеткавая этыка: калі чалавек зацікавіцца, ён сам добраахвотна зробіць рэпост.

Не рэкамендуецца таксама адзначаць сяброў на здымках без іх дазволу, размяшчаць фота і віншаванні на чужых старонках без дазволу іх гаспадароў, злоўжываць хэштэгамі.

Прыкметай дрэннага тону лічыцца і празмернае захапленне сэлфі. Больш таго, псіхіятры ўжо адносяць гэту бяцкам бы бяскрыўдную «забаву» да псіхічных расстройстваў. Таксама не рэкамендуецца часта выкладваць фота з месцаў, якія вы наведалі, таму што такім чынам вы транслюеце ў сеткі анлайн сваё прыватнае жыццё.

## САМАПРЭЗЕНТАЦЫЯ Ў СЕЦІВЕ

Педагогам ні ў якім разе нельга ўмешвацца ў публічныя канфлікты. Усё напісанае застаецца ў сеціве, таму праз пэўны час словы і каментарыі могуць вырваць з кантэксту і накіраваць супраць настаўніка. Не спрабуйце пераспрачаць троля і памятайце, што вы можаце няправільна зразумець праз экран эмоцыі і інтанацыі іншых людзей, як і іншыя людзі могуць памыліцца ў вашых.

Пісаць у сетках педагог павінен правільна і без скарачэнняў, таму што ўсяму, што ён робіць, удзяляецца асаблівая ўвага. Настаўнік заўсёды знаходзіцца «пад прыцэлам».

**«Вобраз настаўніка ў класе, школе і ў сацыяльных сетках павінен супадаць. Таму беражыце сваю рэпутацыю.**

Яшчэ адно правіла — дапамагайце іншым там, дзе гэта можна зрабіць. Трэба ўдзельнічаць у розных сеткавых суполках, у тым ліку прафесійных, арганізоўваць групы па інтарэсах.

Калі ў сацыяльных сетках настаўнік сябруе са сваімі вучнямі, то варта ў наладах прыбраць магчымасць бачыць спіс сяброў на старонцы іншым карыстальнікам. Калі настаўнік са сваімі вучнямі стварае групу, то яна павінна быць закрытай, каб далучыцца да яе можна было толькі па запрашэнні членаў гэтай суполкі.

Публікаваць фота дзяцей без іх згоды забараняецца. Выключэнне — групавое фота, калі твары відаць толькі здалёку.

**— Навучальнае ўзаемадзеянне з дзецьмі, абмен з імі актуальнай інфармацыяй павінны быць не толькі ў школе, але і ў анлайн-прасторы,** — падкрэслівае Вікторыя Ізмагурава. — Вось толькі сфера ўплыву педагога тут пашыраецца, бо ў інтэрнэце дзеці сутыкаюцца зусім з іншымі рызыкамі, і настаўнік павінен быць гатовы ім дапамагчы.

Пэўны час таму праводзілася даследаванне, якое ўстанавіла, што на першае месца па значнасці атрыманай інфармацыі школьнікі ставяць бацькоў, на другое месца — інтэрнэт, а настаўнікі займаюць толькі трэцюю пазіцыю. Таму ролевы рэпертуар педагогам сёння раяць пашыраць і ўвесці ў яго ролю навігатара ў медыясвеце. Настаўнік павінен дапамагаць вучням адбіраць якасны кантэнт і фарміраваць нормы ацэньвання інфармацыі.

**— Удзел педагога ў інтэрнэт-жыцці вучняў патрабуе вялікай адказнасці, ён фактычна пазбаўлены прыватнага жыцця ў сацыяльных сетках. Гэта трэба зразумець і прыняць,** — канстатуе Вікторыя Ізмагурава. — Асабістая старонка — гэта яго самапрэзентацыя ў інтэрнэце, таму вельмі важна правільна кіраваць гэтым рэсурсам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Педсавет*

## У кожнай сеткі — свой статус

— Імідж педагога — у яго руках, — упэўнена **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы, рэдактар партала nastaunik.info Тамара МАЦКЕВІЧ.** — Розныя сацыяльныя сеткі маюць розны сацыяльны статус. Калі ваша асноўная персанальная старонка знаходзіцца ў **«Аднакласніках»**, то вы, хутчэй за ўсё, у вачах вашых вучняў належыце да ніжэйшага класу. Дзеці называюць гэтую сетку «аднаглазнікі».

Беларускія вучні і студэнты па звычцы жывуць «УКантакце». Калі вы малады настаўнік і вучні вас лічаць за свайго, можаце завесці акаўнт там.

Беларускі сегмент **«Фэйсбука»** прынята лічыць інтэлектуальным, ён «заселены» інтэлігенцыяй і ўмоўным сярэднім класам. Там, у адрозненне ад «Аднакласнікаў», не прынята штодня дзяліцца рэцэптамі пірагоў, графаманскімі вершамі, цудадзейнымі іконамі, букетамі і настальгіраваць па дарэмна пражытай маладосці... Хоць пры перасяленні з «Аднакласнікаў» іх «жыхары» часам пераносяць у «Фэйсбук» і старыя звычкі. Настаўнікі, напрыклад, вельмі любяць дзяліцца неглыбокімі артыкуламі з сумнеўных сайтаў, створанымі для вірусный рэкламы, усялякімі абвесткамі пра дапамогу і спачуванне «няшчасным людзям», якіх яны асабіста не ведаюць.

Да таго ж у «Фэйсбуку» дзейнічае шмат пляцовак для прафесійных стасункаў педагогаў, можна далучыцца да груп па інтарэсах, падпісацца на старонку любых выданняў з любой краіны: ад «Настаўніцкай газеты» да Washington Post.

Калі вы маеце старонку на **Google+**, то адразу трапляеце ў лік «прасунутых прафесіяналаў». Вашы вучні будуць ведаць, што вы карыстаецеся ўсімі сучаснымі google-сэрвісамі для навучання, захоўвання інфармацыі, абмену прафесійнымі (і не толькі) матэрыяламі, у тым ліку і ўласным каналам **YouTube**.

Калі вы любіце фатаграфаваць, то вам падыходзіць **«Інстаграм»**. Прысутнасць у гэтай сетцы (як і наяўнасць хобі) дадасць шмат бонусаў у вачах школьнікаў. «Інстаграм», бадай, самая прэстыжная сетка ў маладога пакалення.

А ці не завесці настаўнікам два акаўнты: адзін публічны, а другі — для родных і сяброў, каб «захаваць прыватнае жыццё», пацікавіліся мы ў Тамары Мацкевіч. «Тут кожны вырашае сам, — адказала яна. — Аднак дзеці добра адчуваюць двайное жыццё. Яны альбо не будуць паважаць вас, альбо, яшчэ горш, пярэймуць такую мадэль паводзін. Гэта можа занадта дорага каштаваць і непрымальна для педагога».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Свая ініцыятыва*

# У ПАЛІТЫКІ СА... СТУДЭНТАЎ

**Студэнцкая ліга маладых выбаршчыкаў — ініцыятыва, якую пачалі самі маладыя людзі. Дзякуючы ёй на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ ў мінулым годзе з'явілася дыялогавая пляцоўка, на якой можна пагутарыць з вядомымі дзеячамі краіны. Палітыкі, міністры, дэпутаты адказваюць на актуальныя пытанні і дапамагаюць рэалізоўваць ініцыятывы. Акрамя таго, гэты праект таксама можа адыграць важную ролю ў арганізацыі стварэння рэспубліканскага маладзёжнага парламенцкага органа.**

«Пасля паступлення на наш факультэт былыя школьнікі, якія цікавяцца палітыкай, вырашылі працягнуць гэту дзейнасць і ва ўніверсітэце і звярнуліся да нас у дэканат. Сумесна мы ўдасканалілі ідэю», — расказаў **кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН.**

У мінулым годзе адбылося ўрачыстае адкрыццё праекта з удзелам старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай. «Ужо сёлета ў студэнцкай лізе прымаюць удзел не толькі студэнты ФФСН, але і іншых факультэтаў БДУ. Таксама прысутнічаюць вучні выпускных класаў сталіцы. Сэнс у тым, каб студэнты мелі стасункі з пакаленнем, якое прыходзіць ім на змену. Такім чынам забяспечваецца пераемнасць і праводзіцца прафарыентацыя», — растлумачыў дэкан ФФСН БДУ.

На апошняй сустрэчы было ўзнята пытанне аб спартыўным валанцёрстве падчас Еўрагульняў і чэмпіянату свету па хакеі, які будзе праводзіцца сумесна з Латвіяй. **Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, намеснік дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце Вераніка САЙГАНАВА** расказала, што ініцыятыва лігі ўжо была падтрымана. «Гэтае пытанне ўжо знаходзіцца на высокай ступені прапрацоўкі. Таксама мы плануем дадаткова падключыць Міністэрства спорту і турызму», — растлумачыла Вераніка Сайганава.

«Падчас апошняга сходу лігі міністр адукацыі Ігар Карпенка адзначыў, што падобны форум дапаможа рэалізацыі ідэі стварэння маладзёжнага парламента. Цяпер па гэтым пытанні вядуцца дыскусіі. Актыўныя ўдзельнікі лігі могуць стаць яго касцяком», — лічыць Вадзім Гігін.

Плануецца, што работа лігі маладых выбаршчыкаў будзе праводзіцца больш актыўна напярэдадні выбараў у мясцовыя органы ўлады, якія адбудуцца 18 лютага наступнага года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

*Па парыве душы*

# Калі «Адкрытыя Сэрцы» — «Няма перашкод», «Дабракі»!

## Названы найлепшыя добраахвотнікі года БРСМ

**Пазаўчора, у Міжнародны дзень валанцёра, у сталіцы адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання найлепшых добраахвотнікаў БРСМ па выніках рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца». Для ўдзелу ў фінальным акордзе праекта ў Мінск з усіх куткоў Беларусі з'ехаліся больш за 150 валанцёраў саюза моладзі.**

На базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была арганізавана работа адукацыйных пляцовак і камунікатыўных трэнінгаў па арганізацыі дзейнасці валанцёрскага руху з улікам інтарэсаў і ўзросту добраахвотнікаў БРСМ па розных тэмах. А потым дзейства перамясцілася да навагодняй ёлкі ў гандлёвы цэнтр «Сталіца». Тут прайшоў handmade-кірмаш «Калейдаскоп Дабра» ў падтрымку грамадскай арганізацыі дапамогі хворым дзецям «Беларускі дзіцячы хоспіс», адбыліся майстар-класы па вырабе сімвалаў-талісманаў наступнага года, паштовак, ёлачных цацак. Атмасферу свята дапамагалі ствараць клоўны, фокуснікі, мімы. Ну і апафеозам мерапрыемства, вядома, стала ўзнагароджанне найлепшых добраахвотнікаў.

У намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад сярод вучнёўскай моладзі» быў ушанаваны валанцёрскі атрад «Надзея» лунінецкай сярэдняй школы №4. «Найлепшым валанцёрскім атрадам сярод студэнцкай моладзі» быў прызнаны валанцёрскі атрад «Мы — дзецям» пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта БРСМ Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. «Найлепшым валанцёрскім атрадам сярод працуючай моладзі» назвалі валанцёрскі атрад «Адкрытыя Сэрцы» пярвічнай арганізацыі БРСМ ААТ «Гомсельмаш».

У намінацыі «Асабісты ўклад» найлепшым стаў Арцём Чарткоў, камандзір валанцёрскага атрада «Дабракі» пярвічнай арганізацыі БРСМ Навапольскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа. А спецыяльную прэмію ў гэтай жа намінацыі атрымала кіраўнік валанцёрскага атрада «Эдэльвейс» пры Гомельскім абласным камітэце БРСМ Вераніка Ражкова. У намінацыі «Асабісты ўклад» (інтэрнэт-галасаванне) быў ушанаваны Павел Каптураў, камандзір валанцёрскага атрада «Няма перашкод» пярвічнай арганізацыі БРСМ Юрцаўскай дзіцячага сада — сярэдняй школы Аршанскага раёна.

«Найлепшы валанцёрскі праект» — «Eco-bus» — у пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта БРСМ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. А «Найлепшай групай у сацыяльнай сетцы» была названа група Мінскага абласнога камітэта БРСМ «Добрае Сэрца Міншчыны | валанцёры БРСМ».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Запрашальнік*

# ХТО СТАНЕ «ГАЛОЎНЫМ» СТУДЭНТАМ КРАІНЫ?

## Яго імя даведаемся 8 снежня

**У гэты дзень у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбудзецца фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2017», які сёлета зніtаваны агульнай тэматыкай «Беларусь — крыніца натхнення». Арганізатарам праекта, як заўсёды, выступаюць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Міністэрства адукацыі.**

За права стаць шчаслівым уладальнікам ганаровага тытула папулярнага студэнцкага праекта і новенькага iPhone пазмагаюцца дзесяць студэнтаў — пераможцы рэгіянальных тураў конкурсу, найлепшыя ў вучобе, навуцы, спорце, творчасці і грамадскай дзейнасці.

Атрымаць у творчым спаборніцтве сваё першыя дзясяткі ў залікоўкі канкурсанты змогуць яшчэ да пачатку маладзёжнага шоу. Экзаменацыйная камісія (журы) завочна ацэніць старанні хлопцаў і дзяўчат пры выкананні дамашніх заданняў «Партфоліа» і «Відэаролік «Я — студэнт!» Дарэчы, апошні дае магчымасць кожнаму ўдзельніку стаць «Студэнтам года online» ў аднайменнай дадатковай намінацыі. Галасаванне за відэаролікі арганізавана ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» ў групах «Моладзь Беларусі» і «Знамя юности».

Праявіць інтэлект, кемлівасць, лагічнае мысленне і прадэманстраваць аратарскае майстэрства фіналісты змогуць у інтэлектуальным конкурсе «Твой выбар для тваёй краіны», прысвечаным Году навукі. Гэты экзамен пройдзе ў фармаце вядомай гульні «Інтуіцыя».

Абараніць дыплом на выдатна канкурсантам дапамогуць групы падтрымкі і работа ў адной камандзе, а таксама балы, заробленыя імі падчас творчых конкурсаў: «Я — студэнт!» (самапрэзентацыя) і «Беларусь — крыніца натхнення» (творчы нумар на зададзеную тэму ў любым жанры).

Дарэчы, экзаменацыйная камісія будзе выстаўляць адзнакі ў рэжыме рэальнага часу. Максімальная колькасць выдатных адзнак у заліковай кніжцы наблізіць кожнага канкурсанта да запаветнай мэты. А разрадзіць напружаную абстаноўку ў зале падчас прыняцця выніковага рашэння дапамогуць гурты Naviband і «PRAвакацыя».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Ідэі маладых*

# БЫЦЬ УПЭЎНЕНАЙ У САБЕ!

## Чаму вучаць у «Інстытуце шляхетных дзяўчат»?

**Праект з такой назвай запусцілі сёлета студэнткі БДУ. Не, там не вучаць варыць супы і смяжыць з жартаў мужа. Не XIX стагоддзе ж! У сучасным «Інстытуце шляхетных дзяўчат» «вучаніцам» дапамагаюць павысіць самаацэнку, раскрыць свой талент і зразумець, што ўсе мэты дасягальныя.**



— Кажуць, што добрыя думкі прыходзяць у розныя галовы адначасова. У нас так і атрымалася, — расказвае, як узнікла ідэя, **студэнтка трэцяга курса Інстытута журналістыкі Надзея МАРХЕЛЬ**.

Праект яна распрацоўвала разам з **выпускніцай геаграфічнага факультэта Кацярынай ДУНЕЦ** і **чацвёртакурсніцай Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Вольгай КРАЎЧАНКАЙ**. Дзяўчаты збіраліся, пяклі бліны і пісалі «навучальную праграму».

Трапіць у лік удзельніц аказалася няпроста: месцаў было ўсяго дзесяць, а пададзеных заявак — больш за 70! Адбіралі самых матываваных, каб не «саскочылі» падчас курса, так што напісаць у анкеце «хачу даведацца пра нешта новае» было недастаткова. Прычыны паўдзельнічаць у студэнтак былі розныя. Хтосьці прызнаваўся, што вельмі сароммеецца людзей і таму не ўмее знаёміцца. А адна з дзяўчат напісала ў заяўцы: «Хачу забіць у сабе ўнутранага мужыка». Аказалася, што з-за сваіх грубых манер яна не магла знайсці сабе пару, бо прыгнятала хлопцаў.

На працягу трох месяцаў для дзяўчат праводзілі майстар-класы на розныя тэмы: матывацыя, прыгажосць, грацыя, здароўе. Яны вучыліся этыкету, практыкаваліся ў вакале, займаліся стрэтчынгам (відам фітнесу). Некалькі сустрэч было прысвечана псіхалогіі. На адной з іх, напрыклад, удзельніцы спрабавалі раскрыць свой галоўны талент. Для некаторых дзяўчат было нечаканасцю даведацца, што яны памыліліся з выбарам спецыяльнасці: трэба было ісці вучыцца зусім іншай прафесіі... Быў таксама занятак па нейраграфіцы. Тэхніка заключаецца ў тым, што, пакуль ты думаеш аб праблеме, малюеш лініі, — пытанне само вырашаецца. Што цікава, запрошаныя псіхолагі згаджаліся выступіць для студэнтак бясплатна, хоць звычайна адна іх кансультацыя каштуе да 100 долараў у гадзіну.

Разам з прафесійным стылістам удзельніцы праекта даследавалі свой гардэроб. З часопісных выразак стваралі калаж таго адзення, якое ім падабаецца, а эксперт каментавала ўбачанае. Так, калі дзяўчына выбірае пераважна лёгкія сукенкі, значыць яна хоча, каб яе абаранялі і падтрымлівалі. Адна са студэнтак, дарэчы, пасля гэтага майстар-класу кардынальна змяніла гардэроб: аказалася, што яна пераймала стыль сяброўкі, хоць ёй самой пасуе зусім іншы вобраз. Таму цяпер замест джынсаў і красовак дзяўчына часцей носіць спадніцы і туфлі.

У канцы праекта для дзяўчат зладзілі сапраўдны выпускны — з доўгімі сукенкамі і фотасесіяй. За тры месяцы ўдзельніцы заўважна змяніліся — сталі больш адкрытыя. Вось некаторыя водгукі.

«Калі я ўбачыла аб'яву аб кастынгу, спачатку падумала, што мне, пэўна, не трапіць на праект, паколькі і без мяне будзе шмат ахвотных і тых, хто больш падыходзіць. Але на наступны дзень вырашыла рызыкнуць. І не дарэма. Я прыйшла, каб стаць упэўненай у сваіх сілах. Хачу адзначыць, што вялікі прарыў ёсць», — напісала Вікторыя Грышкевіч. Дарэчы, да ўдзелу ў праекце гэта высокая зграбная дзяўчына хацела паспрабаваць сябе ў якасці мадэлі. Тым больш і прапановы паступалі. Але сціплая Віка не рашалася: строгія бацькі маглі не падтрымаць яе ідэю. А цяпер дзяўчына ўдзельнічае ў модных паказах.

**Прычыны паўдзельнічаць у студэнтак былі розныя. Адна з дзяўчат напісала ў заяўцы: «Хачу забіць у сабе ўнутранага мужыка».**

«З гонарам магу сказаць: «Я шляхетная дзяўчына!», — піша іншая ўдзельніца Настасся Мядзведзьева. — Мне спадабаліся тэмы тыдняў і сама ідэя праекта. Дзякуючы яму я навучылася працаваць у камандзе, стала больш дысцыплінаванай (не спазняюся на пары), правільна планую свой дзень. Пасля сустрэчы з псіхолагам разабралася са сваімі ўнутранымі праблемамі, у мяне палепшыліся адносіны з мамай і сябрамі. Галоўны талент, які я ў сабе раскрыла, дапамагае мне ў арганізацыі ўжо свайго конкурсу. А яшчэ я вучылася любіць сябе такой, якая ёсць».



— Дзяўчаты часта заўважаюць у сабе больш негатыву — маўляў, тоўстая, непрыгожая — і менш звяртаюць увагі на тое, хто яны ёсць насамрэч. Не адчуваюць, што яны ўжо прынцэсы, — агучвае праблему **начальнік аддзела маладзёжных праграм і праектаў упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДУ Наталля КАПАЦЭВІЧ**. — Студэнткі ішлі на праект з мэтай штосьці змяніць у сабе, а ў выніку аказалася, што яны і так таленавітыя, толькі раней не бачылі гэтага.

«Інстытут шляхетных дзяўчат» цяпер удзельнічае ў конкурсе найлепшых маладзёжных праектаў БДУ. А трэцякурсніца Надзея Мархель думае, што добра было б запусціць падобную серыю майстар-класаў для хлопцаў. Раптам хто са студэнтаў падхопіць ідэю? Трэба ж рыхтаваць прынцаў для шляхетных дам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## Извещение о проведении 22 декабря 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Предмет торгов №1 |
|---|
| «В 1/к Здание административно-хозяйственное» общей площадью 71,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41417; «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ Литер Г1/к» общей площадью 34,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41418; электросети (инв. №26/3); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №27/10); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №27/9); кран-балка (инв. №27/8) |
| Площадь земельного участка – 0,1108 га, кадастровый номер 500000000002000714 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 11, 11/1 |
| Начальная цена – 58 313,46 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 5 800,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов №2** |
| «Здание административно-хозяйственное, литер А 1/к» общей площадью 472,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11335; «Б 1-2/к Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ» общей площадью 762,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11333; навес каркасный шиферный (инв. №27/2); навес-пристройка каркасный шиферный (инв. №27/3); электросети (инв. №2604); сеть водопроводная (инв. №2603); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №26/2); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №26/1); автоматическая установка пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (инв. №42795); котел КЧЖ-7-90 «Полымя» (инв. №620/1); котел КВГТ-100 (ТЭМ-100) (инв. №420898); котел TIS UNI 75 (инв. №4000125); забор металлический (инв. №203266); резервуар для хранения нефтепродуктов (инв. №469); стеллажи складские (инв. №27/5); кран-балка (инв. №315) |
| Площадь земельного участка – 0,3237 га, кадастровый номер 500000000002000713 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 12, 12/1 |
| Начальная цена – 357 965,93 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 35 700,00 бел. руб. |

**Продавец имущества** – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 22 декабря 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.12.2017 по 20.12.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»).

МОМО ТОРГОВЫЙ ЦЕНТР

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «МОДНОЕ ЛОТО» В ТОРГОВОМ ЦЕНТРЕ «МОМО»

**Организатор рекламной игры**: Общество с ограниченной ответственностью «Минт филд», УНП 192465627, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 16.02.2016 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192465627.

**Юридический адрес Организатора:** 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 12А, пом. 6, каб. 5.

**Наименование рекламной игры:** «Модное лото».

Свидетельство № 3082 о государственной регистрации Рекламной игры, выданное 29 августа 2017 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Территория проведения рекламной игры:** ТЦ «МОМО», расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 150А.

**Сроки начала и окончания рекламной игры:** с 2 сентября по 15 декабря 2017 г.

**Количество участников рекламной игры:** 5360 человек.

**Призовой фонд разыгран полностью.**

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 44 514 57 75.

**За время проведения рекламной игры обладателями призов стали:**

| № | Номер карточки участника | Фамилия, имя, отчество | Приз | Дата вручения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 00059 | Кравцова Мария Александровна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 04.10.2017 г. |
| 2 | 00100 | Добыш Наталья Леонидовна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 02.10.2017 г. |
| 3 | 00243 | Зенкевич Наталья Евгеньева | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 03.10.2017 г. |
| 4 | 00275 | Дятлова Алла Викторовна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 14.10.2017 г. |
| 5 | 00465 | Каменка Виталий Николаевич | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 02.10.2017 г. |
| 6 | 00664 | Гайденко Юлия Ивановна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 14.10.2017 г. |
| 7 | 00678 | Скорнякова Ольга Анатольевна | Сертификат номинальной стоимостью 100 рублей (комплект 10 шт. номинальной стоимостью 10 рублей) для реализации в магазине ОАО «Галантэя» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 30.09.2017 г. |
| 8 | 01304 | Змачинская Лариса Витальевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 01.10.2017 г. |
| 9 | 01393 | Игнатенко Елена Викторовна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 02.10.2017 г. |
| 10 | 01409 | Савицкая Наталья Михайловна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Марк Формель» | 03.10.2017 г. |
| 11 | 01465 | Рябцева Софья Дмитриевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 03.10.2017 г. |
| 12 | 02853 | Букаткин Антон Григорьевич | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 30.10.2017 г. |
| 13 | 02355 | Шило Дмитрий Васильевич | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 28.10.2017 г. |
| 14 | 02881 | Григорович Татьяна Константиновна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 01.11.2017 г. |
| 15 | 03004 | Волчек Наталья Сергеевна | Сертификат номинальной стоимостью 100 рублей (комплект 10 шт. номинальной стоимостью 10 рублей) для реализации в магазине ОАО «Галантэя» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 29.10.2017 г. |
| 16 | 02361 | Гамеза Александр Владимирович | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Марк Формель» | 30.10.2017 г. |
| 17 | 02346 | Козловский Алексей Антонович | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 29.10.2017 г. |
| 18 | 02192 | Спельникова Нина Валерьевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 28.10.2017 г. |
| 19 | 01798 | Канчина Светлана Михайловна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 28.10.2017 г. |
| 20 | 02059 | Трухан Глеб Борисович | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 25.11.2017 г. |
| 21 | 02908 | Анисович Ольга Владимировна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 05.11.2017 г. |
| 22 | 01801 | Маркова Жанна Анатольевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 30.10.2017 г. |
| 23 | 03538 | Андрейчук Лариса Алексеевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 25.11.2017 г. |
| 24 | 05024 | Коваленко Сергей Николаевич | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 25.11.2017 г. |
| 25 | 03598 | Рогулина Юлия Валерьевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазине «Артимода» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 01.12.2017 г. |
| 26 | 04920 | Шишло Тамара Яновна | Сертификат номинальной стоимостью 100 рублей (комплект 10 шт. номинальной стоимостью 10 рублей) для реализации в магазине ОАО «Галантэя» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 25.11.2017 г. |
| 27 | 05066 | Юркевич Елена Петровна | Сертификат номинальной стоимостью 100 рублей (комплект 10 шт. номинальной стоимостью 10 рублей) для реализации в магазине ОАО «Галантэя» по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 150а | 27.11.2017 г. |
| 28 | 05253 | Ворошкевич Наталья Михайловна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 25.11.2017 г. |
| 29 | 04542 | Волчек Наталья Сергеевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 27.11.2017 г. |
| 30 | 03619 | Баран Лариса Филипповна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Sisters» | 02.12.2017 г. |
| 31 | 04610 | Максимчик Валерий Сергеевич | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в магазинах «Марк Формель» | 25.11.2017 г. |
| 32 | 03481 | Евтухович Анастасия Юрьевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 28.11.2017 г. |
| 33 | 05180 | Баглай Ольга Николаевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 25.11.2017 г. |
| 34 | 03846 | Русальская Анна Николаевна | Подарочный сертификат номинальной стоимостью 100 рублей для реализации в ресторане «Пицца Темпо» (г. Минск, пр-т Партизанский, 150а) | 25.11.2017 г. |
| 35 | 02457 | Шешко Виктория Сергеевна | Денежный приз в размере 5000,00 рублей и денежное вознаграждение в размере 747,13 рублей | 01.12.2017 г. |

Дарэчы, пра форму. Суразмоўніца кажа, што да дзяўчат у «мужчынскай прафесіі» прыглядаюцца больш. Маўляў, ці сапраўды гэтае «дзіця» зможа справіцца са сваімі функцыямі?

— У першую чаргу форма абавязвае да акуратнасці, прычым ва ўсім: у вонкавым выглядзе, словах, паводзінах, — лічыць Ганна. — Але жаноцкасці ў дзяўчат-міліцыянераў хапае, не хвалюйцеся! Яна нават набывае нейкую адмысловую афарбоўку!

Ганна і Мікалай кажуць, што для маладога супрацоўніка вельмі важна трапіць у такі апорны пункт, дзе добры старшы ўчастковы.

— Калі ёсць каманда, прасцей выконваць усе задачы. Але пры гэтым ніколі не ўзнікае нейкіх пытанняў наконт асабістага. Служба ёсць служба. На рабоце мы — калегі, па-за сценамі міліцыі — сябры, — тлумачыць Мікалай. — Ходзім адзін да аднаго ў госці, разам адзначаем святы.

Але, адразу папярэджваюць мае суразмоўнікі, працу дадому яны «не носяць».

* * *

— У вас тут чыста і нияк нават утульна стала, — кажа Ганна, заходзячы ў адну з кватэр, якая мае рэпутацыю прытона.

— Ну, зразумела, я ж кінуў піць, — ганарліва адказвае 50-гадовы гаспадар жылля.

— А хто ў тым пакоі «адпачывае»? — заўважае ў зале постаць Мікалай.

— Дык гэта ж брат мой! — падхопліваецца мужчына.

— А брат не перастаў піць? — удакладняе Ганна.

— Не, але ён стаў цішэйшы ў «гэтых справах». Я ў асноўным сплю, калі ён прыходзіць...

— Калі брат лячыцца пачне?

— Зараз групу па інваліднасці яму працягваць будуць, можа, тады і пакладуць лячыцца, — з сумам кажа гаспадар кватэры.

У Ганны пад кантролем 11 дамоў. Дзяўчына кажа, што свой «падсправаздачны кантынгент» яна ведае добра. Але паасобку «такіх грамадзян» участковыя ўсё роўна не наведваюць.

— Падчас службы ў міліцыі я навучылася кантактаваць з людзьмі і больш кантраляваць сябе эмацыянальна. А кантынгент тут, паверце, розны, — кажа Ганна.

— Праца вучыць нават свае невялікія сямейныя канфлікты спускаць на тармазах. Псіхалогія! У міліцыі без гэтага нікуды, — усміхаючыся, дадае Мікалай. — Увогуле, жонкам супрацоўнікаў трэба аддаць належнае. Яны з намі «сваю службу» нясуць!

Падзяку, як прызнаюцца ўчастковыя, яны чуюць рэдка. У асноўным — ад людзей, якія ў міліцыі «госці» нячастыя.

> **«У мяне тата раней ва ўнутраных войсках служыў. Не раз папярэджваў, што хлеб гэта нялёгкі, але ніколі не адгаворваў».**

— Працавалі на Дні Перамогі. Сям'я пайшла ў кінатэатр і пакінула адчыненым акно ў аўтамабілі. На сеанс мабільныя тэлефоны грамадзяне не ўзялі. Каля гадзіны мы «ахоўвалі» маёмасць, а месца было ажыўленае. Сям'я за пільнасць нам была вельмі ўдзячная, — прыгадвае мае суразмоўнікі.

Мікалай прызнаецца, што вельмі не хоча, каб да міліцыі ставіліся як да нейкага карнага органа:

— Не падабаецца, калі бацькі кажуць дзецям: «Вось будзеш няправільна сябе паводзіць — цябе забяро дзядзька міліцыянер, пакарае». Малых, наадварот, павінны вучыць, што супрацоўнік міліцыі — гэта той чалавек, да якога неабходна звяртацца па дапамогу!

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
*asmykovich@zviazda.by*

SEX=БАЛЯСЫ

# НОГІ Ў РУКІ

**Калі не можаш нешта адолець, яго трэба ўзначаліць. Усе ж, мабыць, чулі гэтую фразу? Яе можна перакласці на больш зразумелую мову і як «перахапіць ініцыятыву», і як «змагацца падобным супраць падобнага». («Памяняла мужчыну. І зноў — разумніца, прыгажуня і класна гатую».) Я да таго, што апошнім часам менавіта гэты пасыл становіцца асноўным у рознага кшталту флэшмобах. Не, трэнд у сацыяльных сетках узнік не ўчора, ён проста пакрысе трансфармаваўся, як і ўсё наша жыццё. («— Дзяўчына, а ў такой прыгажуні, як вы, хлопец ёсць? — А табе навошта? Мужыка ў мяне адбіць хочаш?») Прыгадайце, колькі вы бачылі ў інтэрнэце пародый? Калі простыя грамадзяне пры дапамозе падручных сродкаў з гумарам капіравалі вобразы «зорак» — іх адзенне, макіяж, прычоскі, манерныя позы. Ці нават самі артысты аналагічным чынам жартавалі над калегамі па «цэху». Але калі дагэтуль у такіх пародыях было больш смешнага, дык цяпер стала пераважаць сацыяльнае. Лідзіруе з задумамі, вядома ж, прыгожы пол. («Жаночая логіка — гэта цвёрдая ўпэўненасць у тым, што любую аб'ектыўную рэальнасць можна пераадолець жаданнем».) Чым яны здзіўляюць і да чаго спрабуюць прыцягнуць увагу?**

Ну вось з самага апошняга. У «Інстаграме» дзяўчаты масава шырока расставілі ногі. Не, не падумайце нічога такога, хто не ў курсе. Гэта ўсяго толькі флэшмоб — вуменспрэдынг — скіраваны, як няцяжка здагадацца, супраць такой з'явы, як менспрэдынг. Назва паходзіць ад англійскіх слоў «мужчына» і «раскідваць». («Як сябе забавіць? Лёгка! Падыдзіце да незнаёмага мужчыны са словамі: «Што, думаў, я цябе не знайду?») У многіх краінах свету адзначаюць манеру дужага полу сядзець у транспарце, шырока расставіўшы ногі. Што, вядома, стварае нязручнасці для іншых пасажыраў. З гэтым спрабуюць змагацца рознымі спосабамі. У Нью-Ёрку, напрыклад, можна атрымаць за такія паводзіны штраф — былі выпадкі, калі паліцэйскія сапраўды арыштоўвалі мужчын за шырока расстаўленыя ногі. У мадрыдскім метро з'явіліся спецыяльныя забараняючыя знакі кшталту тых, што нельга есці ў вагоне марожанае, курыць і г. д. Толькі ў нашым выпадку — не раскідваць ногі па баках. Падобная сацыяльная рэклама з'явілася і ў многіх іншых гарадах свету. А дзяўчаты яе на свой капыл падхапілі. («Людзі прыходзяць і сыходзяць. Уся справа ў нагах».) Праўда, ёсць і версія, што такім чынам прадстаўніцы прыгожага полу проста дэманструюць сваю сексуальнасць. («— Дзяўчаты, я пахудзела на два памеры! — Якая ж ты малайчынка, мярзотніца».) Яны пачалі сотнямі выкладваць здымкі, на якіх прымаюць характэрную для многіх мужчын позу, падмацоўваючы яе валявымі выразамі твару для брутальнасці. З іншага боку, многія з прадстаўніц прыгожага полу не падтрымалі сваіх каляжанак, маўляў, справа ў звычайнай анатоміі. («Я не асуджаю дзяўчат з няголенымі нагамі. Я твар галіць лянуюся, а тут цэлая нага... Нават дзве!») Дарэчы, мужчыны менавіта гэтым і тлумачаць становішча ў прасторы сваіх канечнасцяў. Працiўнікі парыруюць — элементарную культуру ніхто не адмяняў, маўляў, любы мужчына можа сядзець у транспарце так, каб не дастаўляць дыскамфорту іншым пасажырам.

**Пасыл тут зноў жа просты — даць на гэты раз па руках нягоднікам, якія іх распускаюць.**



З апошнім цяжка не пагадзіцца, таму, на мой погляд, у нашым метро праблему можна вырашыць даволі простым спосабам. Тымі ж спецыяльнымі знакамі на асобных месцах для сядзення. Толькі на забараняючымі, а дазваляючымі. На жоўтым фоне — як для інвалідаў — надпіс кшталту «Для тых, каму муляе». Усе такія ўнікумы не тое што сядзець правільна будуць, увогуле стоячы паедуць, гарантую. («— Сямён, вы, выпадкова, не шахцёр? — Не, я не выпадкова, я прынцыпова не шахцёр».) Жартую, вядома, хаця, як той казаў, у кожным жарце ёсць доля праўды.

Магчыма, яна ёсць і ў аўтаркі чарговага флэшмоба — студэнткі з Санкт-Пецярбурга. Будучы юрыст зняла ролік, у якім дзяўчына павольна задзірае спадніцу, знаходзячыся па чарзе на розных станцыях метрапалітэна. Гераіня робіць гэта ў той момант, калі з вагонаў выходзіць паток пасажыраў. («— Мілая, ты ўся такая паветраная... — Што, як піражнае безэ? — Не, як трывога!») Кадрам папярэднічае запіс: «Гэтае відэа прысвечана ўсім аматарам падглядаць пад спадніцы. Ад імя ўсіх дзяўчат, якія сталі вашымі ахвярамі. Наце, глядзіце! І да нас не набліжайцеся!» Пасыл тут зноў жа просты — даць на гэты раз па руках нягоднікам, якія іх распускаюць. З'ява падглядвання называецца апскёртынгам. Вычварэнцы здымаюць усё на тэлефоны і выкладваюць у сеціва. Але...

Варта заўважыць, што такія «забаўкі» сапраўды мелі месца — калі толькі з'явіліся тэлефоны з камерамі. Зараз гэта, прабачце, дробязь у параўнанні з цяперашнімі «ўпіскамі». Але аўтарка назвала з'яву маштабнай і заклікала прызнаць яе злачынствам супраць асобы. («Лягчэй за ўсё зносіць крыўды, калі кіруеш бульдозерам».) Што, у сваю чаргу, выклікала неўразуменне ў карыстальнікаў, якія папракнулі студэнтку ў жаданні атрымаць лёгкую славу, бо ролік з'явіўся адразу пасля галівудскага сексуальнага скандалу. Выпадкова ці не, але аўтарка вельмі хутка ўзялася за справу... Як той казаў — ногі ў рукі?.. («Пакуль дзяўчаты не пачнуць прыводзіць мяне ў бар, каб напаіць за свой кошт і потым развесці мяне на секс у сябе дома, пры гэтым робячы пастаянныя кампліменты маім нагам, ні аб якой роўнасці палоў не можа быць і гаворкі».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Ніколі не забуду эмоцый ад «Еўрабачання»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці памятаеш тыя эмоцыі, якія адчувала падчас конкурсу?***

— Калі ехала, спецыяльна праграмавала сябе, нават пісала ў нататніку: «Я павінна ўвайсці ў тройку найлепшых». І ўвайшла ў гэтую тройку, але ніколі не забуду свае эмоцыі. Калі называлі балы, доўга была першай, потым стала другой, потым зноў першая. Я была блізка да перамогі, але ў выніку заняла трэцяе месца. І ніколі не змагу забыць тыя перажыванні.

***— Калі б прапанавалі, паехала б зараз на дарослае «Еўрабачанне»?***

— Зноў жа, калі будзе якасны матэрыял і добрая каманда. Трэба разумець, што дзіцячы конкурс і дарослы — абсалютна розныя. У першым выпадку адразу відаць дзіця і яго талент. На дарослым «Еўрабачанні» больш важна, як ты будзеш здзіўляць публіку. Гэта шоу. Напэўна, формула поспеху прыкладна такая: яркі вобраз, эмоцыі, простая запамінальная песня.



**«Мая мама пачала заўважаць, што яе дачку ўсё гэта зацягвае, і сказала: «Тое, што ты зрабіла, не толькі твая заслуга. Якой ты была, такой і засталася».**

Я камунікую з «дзецьмі «Еўрабачання», як нас вельмі часта называюць. Сустракаюся з Воляй Сацюк, якая працягвае музычную кар'еру ў Беларусі, Русланам Асланавым. Кантактую з Юрам Дземідовічам. Ён зараз у Маскве, займаецца музыкай, удзельнічае ў конкурсах. Дарэчы, вельмі цікава, што яго параненйшаму часам успрымаюць як таго самага «чароўнага трусіка». Як і мяне, бывае, называюць «анёлам дабра».

***— Калі знаёмішся з людзьмі, кажаш, што ты ўдзельнічала ў дзіцячым конкурсе?***

— «Дзеці «Еўрабачання», мне здаецца, ніколі не гавораць пры знаёмстве з кімсьці аб тым, што ўдзельнічалі ў ім. Са мной бывалі сітуацыі, калі чалавек, якому стала вядома аб гэтым факце, пачынаў ставіцца да мяне не вельмі добра. Іншымі словамі, не даведаўшыся пра мяне больш, адразу думаў, што я лічу сабе «зоркай». І тады вельмі хочаш даказаць адваротнае: ты звычайная, такая ж, як і ўсе астатнія дзяўчаткі.

***— Ці дапамагае ўдзел у «Еўрабачанні» ў жыцці?***

— Безумоўна, гэта быў каласальны вопыт. Конкурс навучыў мяне трымацца, прэзентаваць сябе, заводзіць стасункі. У мяне ўнутры з'явіўся нейкі «стрыжань». Што датычыцца вучобы... Не было такога, што на нейкім іспыце мне ставілі адзнаку толькі за тое, што я ўдзельнічала ў «Еўрабачанні». Мабыць, таму, што Інстытут журналістыкі БДУ прыцягвае шмат таленавітых людзей. І тут нікога не здзівіць тым, што хтосьці дзесьці спявае ці ўдзельнічае ў нейкіх конкурсах.

Але вось, напрыклад, мой вопыт быў вельмі карысны для БДУ, калі мне прапанавалі паўдзельнічаць у міжнародным песенным конкурсе сярод моладзі «Youthvision» у Азербайджане. Там мы прадстаўлялі журы не ўласныя кампазіцыі, а каверы.

***— Што наконт «зорнай хваробы»? Ці была яна ў цябе?***

— Была *(смяецца)*, але яе вельмі хутка адбілі. Я толькі вярнулася з «Еўрабачання», мяне сустракалі ўсёй школай, я праз дзень давала інтэрв'ю, бывала на прыёмах. Мая мама пачала заўважаць, што яе дачку ўсё гэта зацягвае, і сказала: «Тое, што ты зрабіла, не толькі твая заслуга. Якой ты была, такой і засталася». Яна сказала гэта вельмі спакойна, але яе словы вельмі балюча ўдарылі. І я сапраўды зразумела: так, я часьці дасягнула, але не маю права лічыць сябе «каралевай».

***— Кім бачыш сябе праз 10 гадоў?***

— У «Белтэлерадыёкампаніі». Але не вядучай навін, а, напрыклад, асістэнтам прадзюсара. Мне падабаецца прыдумляць новыя праекты, займацца іх арганізацыяй. Яшчэ праз 10 гадоў я бачу сябе мамай.



***— Як адпачываеш ад заняткаў ва ўніверсітэце і сцэны?***

— Так выйшла, што свой вольны час я часцей за ўсё праводжу ва ўніверсітэце. З сябрамі і калегамі мы працуем над новымі праектамі. Так адпачываю і атрымліваю ад гэтага задавальненне, нават калі прыходжу дадому ў 23.57.

Яшчэ я люблю чытаць. Доўга, удумліва, штосьці адзначаць для сябе. Адна з апошніх кніг, якую я прачытала, — «Мастацтва кахаць» Эрыха Фрома.

Люблю глядзець фільмы і серыялы, хаджу з сябрамі на выстаўкі ў Нацыянальны мастацкі музей. Але доўга так праводзіць час усё роўна не магу. Калі ў мяне канікулы, ужо праз тры-чатыры дні я зноў хачу працаваць, ладзіць праекты, сустракацца і знаёміцца з людзьмі.

***— У 2018 годзе Беларусь зноў прыме ў сябе дзіцячы конкурс...***

— Гэта вельмі крута! Я была вельмі рада, калі даведалася пра тое. У Беларусі ёсць прафесійная крэатыўная каманда, якая да драбнюткіх тонкасцяў прадумае ўвесь конкурс. У 2011 годзе шведскія аператары і менеджары дзіцячага «Еўрабачання» з цяплом успаміналі арганізацыю конкурса ў Беларусі годам раней. Таму што ўсё было зроблена на вышэйшым узроўні. Для нашай краіны гэта перш за ўсё выдатны піяр. А яшчэ вопыт для ўсіх, хто ўдзельнічае ў арганізацыі і ў асвятленні падзеі.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by.*

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.12.2017 г.

■ Шануй сваё!

# З ПЕСНЯЙ ЖЫЦЬ ЛЯГЧЭЙ!

## Кіраўнік «Вербіцы» Алесь Свірскі пра сакрэты народных спеваў і іх месца ў сучасным жыцці



**Там, дзе спяваюць беларускія народныя песні, ажывае душа! У яе быццам з'яўляюцца нябачныя крылы, якія дапамагаюць узняцца панад мітуснёй і жыццёвымі праблемамі. Раней без добрай песні не абыходзілася ні адно застолле. Аднак у наш час народныя спевы гучаць усё радзей і радзей. Ці, можа, наадварот, гэта творчасць знаходзіць новае месца ў сучаснай культуры? Каб разабрацца ва ўсіх таямніцах народных спеваў, а таксама паслухаць іх у жывым выкананні, карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з мастацкім кіраўніком беларускага народнага фальклорнага ансамбля «Вербіца» Алесем СВІРСКІМ.**

***— У вашага калектыву надзвычай багатая музычная палітра. Як падбіраеце творы?***

— Мы выконваем народныя аўтэнтычныя песні, таксама іх апрацоўкі. Гэта досыць вядомыя творы — іх спяваюць многія калектывы. Але галоўнае, як яны спяваюцца... Асабіста мы вылучаемся душэўнасцю і праўдзівасцю — імкнёмся так данесці твор да слухача, каб закрануць яго душу. Спяваем народныя песні розных краін — не толькі беларускія, але і польскія, латышскія, літоўскія. Бо калі едзем за мяжу, то, як падарунак, вязём песню той краіны, у якую завітваем. У Польшчы бываем найчасцей, таму ў нас шмат развучаных песень гэтай краіны. Вось і нядаўна ездзілі туды на фестываль патрыятычнай песні. Аднак у нашым рэпертуары не толькі народныя, але і духоўныя песні — адпаведны цыкл выконваем, калі даводзіцца выступаць у цэрквах ці касцёлах. Такім чынам, ёсць рэлігійныя, калядныя песні. Маем і купальскія, жніўныя творы, якія не выкарыстоўваем часта, але спяваем пры патрэбе. Напрыклад, падчас Дажынак пелі жніўныя песні, калі на Купалле запрасілі выступіць, — адпаведна, мелі падрыхтаваныя кампазіцыі.

***— Вось вы кажаце пра выступленні за мяжой... А як там даведваюцца пра ваш калектыў?***

— Дзякуючы сацыяльным сеткам і напрацаваным знаёмствам. Скажу шчыра, за мяжу запрашаюць выступіць нават часцей, чым у Беларусі. Тут айчынная культура не вельмі ў пашане і не надта запатрабаваная. Большым попытам карыстаецца попмузыка. Але праз гэта мы губляем свае карані. Бо народная песня прыйшла ад матуль, ад бабуль, у ёй закладзены генетычны код, які перадаецца нам. Калі мы будзем адмаўляцца ад яго, то згубім сябе як нацыю і як народ. Натуральна, я не заклікаю ўсіх спяваць народныя песні. Але кожная грамада, якая сябе паважае, пры адпаведных умовах спявае — калі надараецца свята напрыклад. Гэта тая нітачка, якая злучае з продкамі, перадаецца ад пакалення да пакалення. У ёй ёсць пэўная энергія, таму губляць такое нельга. Трэба, каб і ў садках, і ў школах гучалі народныя песні.

***— Сапраўды, прыгадваюцца сямейныя застоллі, на якіх пастаянна спявалі. Цяпер гэта традыцыя быццам бы адыходзіць...***

— Па-першае, людзі перасталі так часта сустракацца, хадзіць адзін да аднаго ў госці. Раней не было камп'ютараў, мабільных тэлефонаў, таму сустракаліся і размаўлялі, глядзячы адзін аднаму ў вочы. А зараз жывыя стасункі замяняюць электронная скрыня, вайбер і іншыя прыстасаванні, якія, з аднаго боку, палепшылі жыццё чалавека, зрабілі яго лягчэйшым. Але ў той жа час людзі сталі не так часта, як хацелася б, бачыцца і ладзіць нейкія агульныя святы. Калі раней нехта прыходзіў у госці, гэта было сапраўднай падзеяй. Накрывалі стол, сядзелі, размаўлялі, спявалі. У маім дзяцінстве таксама пастаянна прыходзілі госці да бацькоў і, натуральна ж, усе разам спявалі. Цяпер гэта традыцыя замяняецца тэлебачаннем, радыё, на якіх ёсць музычныя каналы, смартфонамі... Падаецца, навошта спяваць, калі можна паглядзець і паслухаць.

***— Хто ж спявае ў вашым ансамблі?***

— Гэта не прафесіяналы — аматары. Людзі, якія пасля працы едуць на спевы. Хтосьці ў думках перажывае, што дома дзіця адно робіць урокі, што трэба яшчэ прыехаць і прыгатаваць сям'і вячэру. Але песня перамагае!.. Працуюць нашы выканаўцы ў розных сферах — у прамысловасці, турызме, тэхабслугоўванні... Гэта вельмі розныя людзі, але ўсіх іх аб'яднала любоў да песні і да таго, што мы робім.

***— Як думаеце, чаму іх натхняюць народныя спевы?***

— Пэўна, песня дае энергетычную зарадку, пэўную радасць у жыцці. З'яўляецца вельмі яскравае адчуванне, калі спяваеш на канцэрце, і людзі табе ўдзячныя, чуеш іх апладысменты. Тыя падзякі, што прыходзяць, і нават слёзы, якія выклікае ў слухачоў тая ці іншая песня, — яны пакідаюць уражанне, што не дарэмна быў пражыты дзень, і што ўвогуле ты не дарэмна з'явіўся на гэты свет. Калі песня кранае пэўныя струны ў сэрцы, душы людзей, значыць, ты робіш добрую справу, і яна не дарэмная.

***— Адчуваецца высокі ўзровень спевакоў «Вербіцы»...***

— Натуральна, стараемся, сам ансамбль існуе ўжо 37 гадоў. Нядаўна склад «Вербіцы» змяніўся, амаладзіўся: старэйшыя пайшлі на заслужаны адпачынак. Індывідуальную пастаноўку голасу з кожным не робім, але праводзяцца распеўкі. Ладзіцца работа па культуры спеваў. Я скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры па класе «харавыя спевы» ў прафесара Дробыша, ужо нябожчыка. З ансамблем «Валачобнікі» ў свой час мы аб'ездзілі паўсвету і там я атрымаў шмат досведу. У гэтых паездках найперш пасябраваў з беларусамі замежжа. Нас запрашалі выступаць нават аргенцінскія беларусы!

***— Песні ў хатах часам яшчэ даводзіцца чуць. А вось пераемнасць танцавальнай культуры, здаецца, зусім згубілася...***

— І сёння існуюць простыя, народныя танцы, якія выконваліся здаўна. І ў іх няма нейкіх складаных элементаў. Мы часам танцуем польку-бабачку, кракавяк, ойру. Такія танцы акурат нясуць станоўчы эмацыянальны зарад і ў той жа час з'яўляюцца вельмі добрым фітнесам. Скажу нават больш: я параіў



бы ўсім тым, хто клапоціцца пра сваё здароўе і хоча захаваць добрую фігуру, — спявайце і танцуйце!

***— Ці ладзіце танцавальныя вечарынкі?***

— Так, у нас праходзілі фальклорныя танцавальныя вечарыны. Разам з вядомым бардам і дударом Змітром Сідаровічам, які, на жаль, ужо памёр, у Палацы культуры МАЗа ў Мінску мы ладзілі такія вечарыны. Шмат людзей збіралася. Танцавалі на працягу дзвюх з паловай гадзін пад жывы гук — дуду, скрыпку, бубен, гармонік, цымбалы...

***— Чаму не ладзіце нешта падобнае ў наш час?***

— Гэта робяць іншыя людзі, у цэнтры сталіцы. Палац, у якім мы збіраемся, размяшчаецца не ў такім зручным месцы — людзям складана сюды дабірацца. А патрэбна большая масавасць. З іншага боку, нават на канцэрты не заўсёды распрадаюцца квіткі — чуў, што такая ж сітуацыя і ў іншых залах. Народ не вельмі багаты, таму неахвотна наведвае культурныя імпрэзы.

***— Распавядзіце, як быў заснаваны ваш калектыў?***

— Утварыўся ансамбль у 1979 годзе. Напачатку спевакі збіраліся на базе завода механазборачнай вытворчасці. Калектыў тады быў жаночы і меў назву «Рунь». Потым далучыліся мужчыны, акурат пабудаваўся Палац культуры МАЗа, дзе і пачалі займацца. Займелі назву «Вербіца» — ад «вярбы», вельмі гнуткай расліны, якую ў той жа час цяжка зламаць. Гэта сімвалічна для нашага ансамбля, бо мы маем свой погляд на ўсе рэчы — і на песні, і на танцы, і на жыццё — мы хінёмся, але зламіць нас немагчыма. І гэта першая расліна, якая абуджаецца вясной, на ёй распускаюцца коцікі — што таксама для нас сімвалічна.

***— Бачу на сцяне ў вашым кабінеце дуду. Гэта ваш уласны інструмент?***

— Дуду мы хацелі набыць даўно, аднак не было грошай. Затое ў нас ёсць свае фанаты, якія пастаянна нас слухаюць, часам бяром іх у паездкі. І вось яны склаліся грашыма і набылі нам дуду... Яшчэ калі вучыўся ва універсітэце культуры і ўваходзіў у «Валачобнікі», іграў на розных інструментах — у тым ліку і на дудзе, а таксама на дудачцы, на гармоніку.

***— Вы захапляецеся гісторыяй, папулярызуеце народныя песні. Як бы вы ахарактарызавалі наш час, ці цікавяцца людзі сваім мінулым?***

— У грамадстве ёсць цікавасць. Але людзям трэба даць выбар. Не варта нічога насаджваць гвалтоўна. Бо поп-музыка сёння навязваецца: які канал ні ўключы, адусюль яна іграе. Пэўна, мы адзіная краіна, дзе на fm-радыё няма класічнай хвалі. Ва ўсім свеце ёсць такія каналы, у некаторыя гадзіны класіка мяняецца на народныя творы, фальклор. У нас жа толькі на Першым канале беларускага радыё і на канале «Культура» можна зрэдку штосьці такое пачуць. Калі і з'яўляюцца пэўныя перадачы, такія, як «Спявай, душа народная», яны доўга не існуюць. Калісьці быў фалькларыст Васіль Ліцвінка, які па тэлебачанні яшчэ ў савецкі час рабіў перадачы «Запрашаем на вячоркі». З розных вёсак прывозілі музыкаў — яны ладзілі такія ж вячоркі, як і ў вёсках. На жаль, гэта традыцыя сёння згублена, трэба яе аднаўляць. І заахвочваць людзей: цяжкія часы лягчэй перажываюцца з песняй. Унутраны стрыжань, энергія народнай творчасці дапамагуць знайсці выйсце са складаных сітуацый.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Жывая спадчына

# АДЗІН НА ЎВЕСЬ РАЁН

## ХЛОПЕЦ ВУЧЫЎСЯ НА КАМУНАЛЬНІКА, АЛЕ ПАЙШОЎ У... ТКАЧЫ

**Наша знаёмства адбылося на свяце млынароў у Адэльску. У імправізаванай сялянскай хаце з рознымі даўнішнімі прыладамі стаялі, між іншым, і кросны, за якімі сядзеў хлопец. Можа проста месца няма, каб сесці, падумалася. Але раптам заўважыла, што ён працуе, кросны рухаюцца, а з іх спаўзае яркі ў палоску палавік. Такі некалі ткалі на вёсках, а зараз купляюць і для гарадскіх кватэр. Пазнаёміліся.**

Аказваецца 20-гадовы Вадзім Гняцецкі даўно захапіўся дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, хоць і выбраў іншую прафесію. Скончыўшы каледж камунальнай гаспадаркі, працаваў у садзе мясцовага СВК. Але вырашыў, што будзе больш толку, калі ён звяжа свой лёс з творчасцю. У мясцовым цэнтры культуры знайшлася стаўка загадчыка творчай лабараторыі. І цяпер, лічыць Вадзім, гэта справа стала сэнсам яго жыцця, бо дае магчымасць удасканальваць майстэрства, рабіць прыгожыя рэчы, паказваць іх на многіх раённых і абласных святах.



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Праўда, зарабіць на гэтым пакуль складана, кажа Вадзім. Можа, калі толькі на які вялікі фэст выехаць, такі, напрыклад, як «Славянскі базар». Бо чуў, што там тканыя палавікі бойка ішлі па 15—20 рублёў за метр. Але ў скарбонцы маладога ткача іншыя каштоўнасці — дыпломы, узнагароды за перамогу ў конкурсах, пленэрах. У яго калекцыі вышыўкі ёсць нават абраз Ісуса, які ён асвяціў у мясцовым касцёле.

Дарэчы, з вышыўкі і пачаўся яго творчы шлях.

Чаму так здарылася, хлопец і сам не ведае. Калі яго сябрукі пасля школы спяшаліся ў спартыўную залу ці на стадыён, яго цягнула ў цэнтр культуры. Сюды, на гурток вышыўкі, якім і цяпер кіруе Наталля Кавалькова, ён прыйшоў хіба што ў класе шостым, успамінае Вадзім. Вакол — адны дзяўчаты. Тады, на першым занятку, ледзьве здолеў вышыць елачку, — рукі не слухаліся. Дзіўна, але хлопец гэты «жаночы» занятак не кідаў. Вышыў ручнік вясельны, з якім на конкурсе першае месца заняў. Канцэртныя касцюмы аздобіў прыгожай вышыўкай. А потым узяўся і за «бабуліна» рамяство — паспрабаваў ткаць. Бабуля дапамагала яму разабрацца з мудрагелістай тэхнікай, хоць і не верыла, што ён не кіне гэту справу. «Каб раней мужчыну за ткацкім станком убачылі, дык засмяялі б, — кажа Наталля Кавалькова. — А сёння толькі дзівяцца. На святах падыходзяць да Вадзіма, каб упэўніцца, што ён не падстаўны, а сапраўды ўмее гэта рабіць».

Хлопец не толькі ўмее добра ткаць, але і марыць асвоіць падвойнае ткацтва, калі дзве асновы рознага колеру звязаны паміж сабой контурным абрысам малюнка — светлага на цёмным, і наадварот. Такія падвойныя дываны яшчэ называюць «гродзенскімі». Захавала і перадала гэта майстэрства зямлячка Вадзіма, самая вядомая ў рэгіёне ткачыха з Адэльска, — Ядвіга Райская (1911—2003). Яна ўмела ткаць 12 узораў, а за зіму і вясну магла стварыць да 10 дываноў. У яе пераймалі вопыт маладзейшыя рукадзельніцы з вёскі Гудзевічы, і цяпер старадаўняя тэхналогія гудзевіцкіх майстрых увайшла ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Дарэчы, у гэтым спісе — тры элементы ткацтва майстроў Гродзеншчыны, што сведчыць аб важнасці захавання рэгіянальнай традыцыі ў беларускай культуры.

Да старажытнага рамяства далучаюцца і мужчыны. У вобласці многія ведаюць таленавітага ткача Яўгена Маркевіча, які таксама асвоіў тэхніку «гродзенскіх дываноў», хоць сам па прафесіі ўрач. І ўсё ж, хлопцы ў гэтай справе пакуль рэдкасць. Вадзім Гняцецкі — на ўвесь Гродзенскі раён адзіны мужчына-ткач. І вельмі гэтым ганарыцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
01.12.2017 г.
Сушко С. А.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
# ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков Закрытого акционерного общества «БТА БАНК»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента облигаций (на белорусском и русском языках):**

на белорусском языке:
полное: Закрытае акцыянернае таварыства «БТА Банк»;
сокращенное: ЗАТ «БТА Банк»;
на русском языке:
полное: Закрытое акционерное общество «БТА Банк»;
сокращенное: ЗАО «БТА Банк»;
(далее – Банк).

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, адрес электронной почты:**

220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В.Хоружей, 20-2;
телефон: +375 (17) 289 58 19; +375 (17) 289 58 09; факс: +375 (17) 289 58 22;
e-mail: info@btabank.by

Официальный сайт Банка в глобальной компьютерной сети Интернет (далее – официальный интернет-сайт Банка): www.btabank.by

**3. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Закрытое акционерное общество «Астанаэксимбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 25 июля 2002 года, регистрационный номер 807000071.

14 апреля 2008 года Национальным банком Республики Беларусь было зарегистрировано изменение наименования банка на Закрытое акционерное общество «БТА Банк».

**4. Сведения о депозитарии Банка.**

Наименование депозитария: депозитарий Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» (далее – ОАО «Банк БелВЭБ»).

Место нахождения: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29.

Дата и номер государственной регистрации: 12.12.1991, регистрационный номер 24.

Наименование органа, его зарегистрировавшего: Национальный банк Республики Беларусь.

Номер специального разрешения (лицензии): №02200/5200-1246-918 выдан согласно решению Министерства финансов Республики Беларусь №155 от 24.05.2012.

Срок действия лицензии: бессрочно.

**5. Размер Уставного фонда Банка.**

По состоянию на 01.09.2017 Уставный фонд Банка составил 24.747.387,64 (Двадцать четыре миллиона семьсот сорок семь тысяч триста восемьдесят семь) белорусских рублей и шестьдесят четыре копейки.

**6. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка в составе, определенном законодательством Республики Беларусь, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка либо о возбуждении в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в Проспект эмиссии, и сроки ее публикации.**

Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка в составе, определенном законодательством Республики Беларусь, будет ежегодно публиковаться в газете «Звязда» в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь, а также размещаться на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг.

Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка за 2016 год опубликована в газете «Звязда» за 25.03.2017 №57, а также размещена на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг 28.04.2017 года.

На едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг и на официальном интернет-сайте Банка (www.btabank.by) Банк раскрывает информацию:

– в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2 (двух) рабочих дней с даты принятия уполномоченным органом Банка такого решения, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; с даты внесения в Единый государственный реестр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности Банка;

– в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – не позднее 2 (двух) рабочих дней с даты получения Банком копии заявления в экономический суд о банкротстве Банка;

– о внесении изменений в Проспект эмиссии облигаций Закрытого акционерного общества «БТА Банк» четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков – не позднее 7 (семи) рабочих дней с даты регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь;

– информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся финансово-хозяйственной деятельности Банка, которые могут повлиять на стоимость облигаций данного выпуска, – в порядке и сроки, установленные Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

Кроме того, вышеуказанная информация будет опубликована в одном из периодических печатных изданий, определенном Президентом Республики Беларусь для обнародования (опубликования) нормативных правовых актов Республики Беларусь (газеты «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка»).

**7. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с Проспектом эмиссии облигаций.**

Ознакомиться, Проспектом эмиссии облигаций Закрытого акционерного общества «БТА Банк» четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков (далее – Проспект) можно на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, на официальном интернет-сайте Банка www.btabank.by, а также в офисе ЗАО «БТА Банк» по адресу: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2, с 9.00 до 16.00, начиная с даты опубликования настоящей Краткой информации об эмиссии облигаций Закрытого акционерного общества «БТА Банк» четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков (далее – Краткая информация) в средствах массовой информации.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**

Решения о четырнадцатом, пятнадцатом, шестнадцатом и семнадцатом выпусках облигаций приняты и утверждены Советом директоров Банка «17» октября 2017 года (протокол № 76).

**9. Цель эмиссии облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.**

Эмиссия облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для диверсификации ресурсной базы Банка.

Средства, полученные от размещения облигаций, будут направлены на выполнение задач, предусмотренных Уставом ЗАО «БТА Банк».

**10. Форма облигаций. Объем выпуска, номинальная стоимость и количество облигаций. Срок обращения облигаций (в календарных днях). Дата начала погашения облигаций. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций для целей погашения облигаций.**

Таблица 1.

Информация о параметрах выпусков, сроке обращения облигаций, датах начала погашения облигаций и формирования реестра владельцев облигаций для целей их погашения.

| Параметры выпуска / Номер выпуска | 14 | 15 | 16 | 17 |
|---|---|---|---|---|
| Вид и форма облигаций | Облигации процентные, именные, бездокументарные (в виде записей на счетах), неконвертируемые | | | |
| Валюта выпуска | Белорусские рубли | Доллары США | Доллары США | Российские рубли |
| Объем выпуска облигаций | 7 000 000,00 (Семь миллионов) | 2 000 000,00 (Два миллиона) | 2 000 000,00 (Два миллиона) | 60 000 000,00 (Шестьдесят миллионов) |
| Номинальная стоимость облигации | 1 000,00 (Одна тысяча) | 10 000,00 (Десять тысяч) | 10 000,00 (Десять тысяч) | 600 000,00 (Шестьсот тысяч) |
| Количество облигаций, штук | 7 000,00 (Семь тысяч) | 200,00 (Двести) | 200,00 (Двести) | 100,00 (Сто) |
| Срок обращения облигаций (в календарных днях) | с 23.11.2017 по 22.11.2022 (1 825 (Одна тысяча восемьсот двадцать пять) календарных дней) | | | |
| Дата начала погашения облигаций | 22.11.2022 | | | |
| Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций, для целей погашения облигаций | 17.11.2022 | | | |

Для расчета срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

**11. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Эмиссия облигаций осуществляется Банком без обеспечения по согласованию с Национальным банком (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 26 октября 2017 №433) в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7. пункта 1 названного Указа Президента Республики Беларусь.

Общий объем выпусков облигаций Банка не превышает размера нормативного капитала Банка, рассчитанный в соответствии с законодательством Республики Беларусь. По состоянию на 01.09.2017 нормативный капитал Банка составляет 53 611 100,00 (Пятьдесят три миллиона шестьсот одиннадцать тысяч сто) белорусских рублей.

**12. Срок размещения облигаций.**

Размещение облигаций осуществляется после опубликования Краткой информации об эмиссии облигаций, заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь в установленном законодательством Республики Беларусь порядке, в периодическом печатном издании, определенном Президентом Республики Беларусь для обнародования (опубликования) нормативных правовых актов Республики Беларусь (газеты «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка», а также размещения ее на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг и на официальном сайте Банка в глобальной компьютерной сети Интернет (www.btabank.by) (далее – интернет-сайте Банка) путем проведения открытой продажи.

Дата начала размещения облигаций: 23 ноября 2017 года.

Дата окончания размещения облигаций: 27 ноября 2020 года, если иной срок не будет определен Советом директоров Банка.

Размещение облигаций прекращается в случае полной реализации всего объема выпуска облигаций.

**13. Условия и порядок размещения облигаций.**

Размещение облигаций Банка осуществляется путем проведения открытой продажи на организованном и/или неорганизованном рынках в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели, как резиденты так и нерезиденты Республики Беларусь, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размещение облигаций на неорганизованном рынке осуществляется на основании договоров купли-продажи (открытой продажи) облигаций, заключаемых по месту нахождения Банка: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2, тел.: + 375 (17) 289 58 19, +375 (17) 289 58 09. Режим работы Банка с клиентами: с 9.00 до 15.00 каждого рабочего дня.

На организованном рынке размещение облигаций осуществляется в торговой системе Открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) в соответствии с законодательством Республики Беларусь по адресу: 200013, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сурганова, 48а. Периоды времени проведения размещения в торговой системе Биржи: в соответствии с регламентом торгового дня по сделкам купли-продажи ценных бумаг, установленным Биржей.

В дату начала открытой продажи облигаций, а также в даты выплаты процентного дохода (указанные в Таблице 2) облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости облигации. В иные даты периода размещения продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату продажи и рассчитывается по формуле:

С = Нп + Дн,

где С – текущая стоимость облигации;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Дн – накопленный процентный доход.

Накопленный процентный доход (Дн) за текущий период начисления дохода рассчитывается по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд}{100} \times \left(\frac{T_{365}}{365} + \frac{T_{366}}{366}\right),$$

где Дн – накопленный процентный доход;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Пд – ставка процентного дохода, установленная Банком и равная: 7 (семи) процентам годовых – для четырнадцатого выпуска облигаций, 3,4 (трем целым и четырем десятым) процента годовых – для пятнадцатого выпуска облигаций, 3,1 (трем целым и одной десятой) процента годовых – для шестнадцатого выпуска облигаций, 7 (семи) процентам годовых – для семнадцатого выпуска облигаций;

$T_{365}$ – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней; $T_{366}$ – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Дата выплаты процентного дохода за предшествующий период (день начала размещения облигаций) и день расчета текущей стоимости облигаций считаются одним днем. Даты выплаты процентного дохода указываются в Таблице 2. Период начисления дохода определяется с даты начала периода размещения облигаций (даты выплаты последнего процентного дохода) по дату расчета текущей стоимости облигаций.

Расчет накопленного процентного дохода и текущей стоимости облигаций осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году, за каждый календарный день года с округлением до двух знаков после запятой с учетом третьей после запятой цифры в следующем порядке:

– если третья цифра после запятой больше или равна 5, то вторая цифра после запятой увеличивается на единицу;

– если третья цифра после запятой меньше 5, то увеличение второй цифры не производится.

Округление осуществляется в соответствии с правилами математического округления с точностью до:

– целой белорусской копейки – по облигациям четырнадцатого выпуска;

– целого цента – по облигациям пятнадцатого и шестнадцатого выпусков;

– целой российской копейки – по облигациям семнадцатого выпуска.

Оплата облигаций при их размещении осуществляется в валюте номинала облигаций в безналичном порядке с использованием текущих (расчетных счетов) юридических лиц и индивидуальных предпринимателей и счетов Банка, указанных в договоре купли-продажи (открытой продажи) облигаций в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь.

**14. Размер и порядок определения размера дохода по облигациям, условия и даты его выплаты.**

